№ 2 (360) 16 студзеня 2004 www.nn.by

тыдзень ТВ

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

DOL.BY
КІНО Ў МЕНСКУ

**Пайшлі бамбіць**

Наезд на ТБМ, манаполія на тэлепраграму.

старонка 3

**Дайце сказаць**

Сяргей Дубавец пра беларускую мову.

старонка 2

**Нацыя аўтаперагоншчыкаў**

Беларусы акупуюць Маскву.

старонка 14

**Чужыя на Бацькаўшчыне**

Эсэ Андрэя Катлярчука.

старонка 15

# Ліцэй назаўжды




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Старонка 3

## Сьнягі

**Празь вялікі сьнег з 12 на 13 студзеня без электрычнасьці засталіся 294 вёскі Віцебшчыны, Гарадзеншчыны й Меншчыны.** Пад цяжарам сьнегу абрынулася дзесяць стрэхаў гаспадарчых пабудоў. Як паведамляе Гідрамэтцэнтар, найбольшае сьнегавое покрыва зафіксавана на Віцебшчыне — 41 см. У сярэднім па краіне яно сягае 30—35 см і ў найбліжэйшыя суткі можа павялічыцца яшчэ на 2—4 см.

## Грузія вяртае гістарычную сымболіку

**Парлямэнт Грузіі разгледзеў пытаньне аб зацьвярджэньні новага дзяржаўнага сьцяга краіны.** Белая палатніна зь вялікім чырвоным крыжам пасярэдзіне і чатырма меншымі ў кутох вядомая з IX ст. Гэты сьцяг выкарыстоўваў апазыцыйны Нацыянальны рух. Раней у якасьці сьцяга краіны выкарыстоўваўся дзяржаўны штандар 1918—1920 г., прыняты тагачасным сацыял-дэмакратычным урадам.

## Бел-чырвона-белыя сьцягі ў сталіцы

**«Зубр» адзначыў трохгодзьдзе свайго руху вывешваньнем у Менску бел-чырвона-белых сьцягоў.** Штандары зьявіліся ў Серабранцы, Малінаўцы, ля вакзалу.

## Кардэн шые ў Бабруйску

**Бабруйскае ААТ «Славянка» зноў шые вопратку пад маркай «П’ер Кардэн» на замову нямецкіх партнэраў, што атрымалі адпаведную ліцэнзію.** Замова — некалькі тысячаў стылёвых мужчынскіх модных вятровак цікавых фасонаў з дарагое якаснае тканіны.

**МБ; БелаПАН**

# Хатабуд

## Зборка–разборка нацыянальных помнікаў

Няма такога помніка, які немагчыма было б узнавіць. Калі я першы раз пачуў гэтую думку ад архітэктара Воінава, быў дужа разгублены. Аднак практыка паказала, што ў Беларусі магчымае ўсё.

Напрыклад, можна дазваньня зьнішчыць самыя старыя дамы на самай старой вуліцы сталіцы і пачаць іх будаваць адпачатку. І назваць «помнікамі». Можна нават прымацаваць зіхоткую таблічку зь пярэстым гербам на зусім новую, яшчэ незамшэлую цагляную сьцяну. І ўжо «помнік» гатовы. Гэтак робіцца з вуліцай Замкавай. Каму цікава, як будуюцца памяткі сівое старасьвеччыны, — можа паназіраць і сёньня.

І не бяды, што там-сям выторкваюцца бэтонныя блёкі й зіхцяць плястыкавыя шклопакеты. Галоўнае — пераканаць усіх, што гэта нацыянальны здабытак. Наагул нашыя «ахоўнікі» спадчыны могуць пераканаць каго заўгодна. У тым, што захаваць помнік не было аніводнае з тысячаў магчымасьцяў. І, пералічыўшы іх усе, канстатаваць, што будынак трэба «разабраць» (гэткім эўфэмізмам прынята ў Беларусі называць зьнішчэньне). А пры патрэбе — «сабраць». Альбо што гэтыя помнікі зусім і ня помнікі. Альбо што можна ўсё зрабіць значна лепей, чым было.

Разборам і зборам падлягаюць цэлыя кварталы Менску. Прафанацыя стала стылем. Тут узьнікаюць пытаньні: чаму б такія «помнікі», як на рагу Камсамольскай і Рэвалюцыйнай, не паставіць і ў іншых раёнах гораду? Альбо, калі мы ўсё робім з нуля, чаму б не паставіць тут муляжы найкаштоўнейшых здабыткаў дойлідства? Пры сёньняшніх тэхналёгіях няцяжка й копію Вострай Брамы пасадзіць у Менску дзе-небудзь на Маркса ці Энгельса.

Гісторыя з роднай хатай Васіля Быкава (старонка 13) у гэтым кантэксьце выглядае цалкам лягічна. Народны быў пісьменьнік? Народны. Патрэбны музэй? Патрэбны. Ну не ў старой жа хаце, праўда? Гэтую «разьбяром», а паставім новую, прыгожую. Каб увесь раён мог ганарыцца! З «эўравагонкай», можна і з «эўравокнамі». Паставілі ж «родную» хату Міцкевіча. Хутка паставяць і «хату Касьцюшкі». Татальны хатабуд.

Ці вяртаюцца цені дзядоў у гэтыя чужыя дамы?

Народнаму пісьменьніку трэ было памерці, каб нехта ў гэтай краіне згадаў пра ягоны родны дом. А куды дзясяткамі гадоў глядзела тамтэйшае начальства? Спакойна назіралі, як руйнуецца нацыянальны скарб. Як цяперака ж спакойна, на вачах СП, ТБМ і ПЭН-Цэнтру, руйнуюць дом Купалавай сям’і. Ня будзе дзіва, калі да якога юбілею прыдумаюць адбудаваць.

Няўжо ж трэба які юбілей прыдумляць, каб нехта парупіўся пра пэнсіянэраў у Бычках, як і ў любой іншай вёсцы?.. А пасьля таго, як адзначаць юбілей, пра іх зноў забудуць. Гляньце на мапу Беларусі... Знайдзіце быкаўскае котлішча. А цяпер паспрабуйце дазнацца, якім чынам туды дабрацца. Ну хто ўсур’ёз думае, што патрэбны каму музэй у вёсцы, дзе дажывае свой нялёгкі век пару дзясяткаў пэнсіянэраў? Сюжэт, як людзі не шкадуюць энэргіі на тое, каб зьнішчыць рэальны помнік, а на ягоным месцы паставіць ягоны ж муляж, варты пяра Кафкі!

Мо прасьцей зрабіць вуліцу з «родных» хатаў у Музэі народнага дойлідства ў Строчыцах? Прынамсі, будзе забясьпечаная наведвальнасьць. А магчыма, і прыбыткі. У гэтай думцы прафанацыі ня болей, чым ва ўсёй хатабудоўлі новых «помнікаў».

**Сяргей Харэўскі**

**Яшчэ адзін помнік разбураны. Зь Бялынічаў — старонка 6.**

# Дайце сказаць

Калі вас называюць крывым — патрабуйце, каб на вас хоць бы зірнулі. І яны пераканаюцца, што ня маюць рацыі. Калі вам кажуць, што вы бесталковы, няхай дадуць шанец даказаць адваротнае. Калі сьцьвярджаюць, што вы мёртвы, — няхай праверaць здароўе, перад тым як засыпаць мерзлым пяском. Але яны ня хочуць глядзець на вас, а тым больш задаваць вам нейкія іспыты ці слухаць вашае дыханьне. У вас няма шанцаў даказаць ім, што вы прыгожы, разумны і дужы. Таму што ў каго ўлада, у таго і «аб'ектыўная праўда» пра вас.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Так выглядае становішча беларускай мовы ў Беларусі на працягу апошніх 200 гадоў. Грубая і нічога ня вартая ў параўнаньні з расейскай ці ангельскай. *Исковерканный русский язык*. Не прыдатная для вялікіх думак, пачуцьцяў і выкарыстаньня ва ўсіх сфэрах жыцьця... Дэ-юрэ — дзяржаўная, дэ-факта — ізгой. Яны ўжо вырашылі, што яна застаецца на пэрыфэрыі гісторыі. Вырашылі, ня слухаючы яе, не выпрабоўваючы «ва ўсіх сфэрах», ня спраўджваючы на «вялікія думкі і пачуцьці». Яны — усе ўлады на працягу 200 гадоў — ані разу не далі ёй шанцу.

За гэтыя 200 гадоў беларуская мова ніколі ані хвіліны насамрэч не была дзяржаўнай, нават калі такой называлася. Гэта значыць, што органы ўлады ніколі ані хвіліны не далі ёй сьцьвердзіцца ў дзяржаўным жыцьці, але пры гэтым давалі ёй свае забойчыя ацэнкі, падобныя на цьвікі, што забіваюць ў труну.

Як можна даваць ацэнку таму, чаго ня ведаеш, чаго не паспытаў, ня выпрабаваў?

За часамі РБ беларуская мова не аднойчы была публічна зьняважаная вуснамі першага прэзыдэнта краіны. Ці гэта — аб'ектыўны закон разьвіцьця? Былі падушаныя ўсе беларускія школы, а апошняя, што выжыла, — ліцэй — душыцца сёньня з асаблівай «аб'ектыўнасьцю». За часамі Лукашэнкі мову судзілі, арыштоўвалі, зьбівалі проста на вуліцы надзеленыя «аб'ектыўнасьцю» амапаўцы. Мову выгналі з тэлевізіі, з кіно і са спажывецкага рынку: на ўпакоўках тавараў можна чытаць тэксты па-латыску, літоўску, польску, расейску і ўкраінску (усе суседзі Беларусі), толькі рэдка — па-беларуску.

Беларуская мова, асуджаная ўладамі на сьметнік гісторыі, тым ня менш выкручваецца, вылазіць, вытыркаецца са сваёй адвечнаю просьбай — дайце шанец, і вы зразумееце, што ня горшая, чым расейская, ці француская, ці іншая якая...

Але няма шанцу. Ёсьць таўро: крывая, бесталковая, мёртвая.

Калі пры канцы СССР беларушчына гатовая была стаць моваю дэмакратычных пераменаў, дык за Лукашэнкам яна ператварылася ў пракажоную — атрыбут «азьвярэлых нацыяналістаў». І без таго загнаная ў ізгоі, яна стала яшчэ й страшылкай для чыноўнікаў усіх узроўняў і для бізнэсу, якія баяцца яе як чорт ладану.

«Аб'ектыўная» маргіналізацыя беларушчыны — гэта цалкам суб'ектыўная дзяржаўная палітыка. Пытаньне: навошта? Няўжо быць бястварым з выгляду расейскім правінцыялам лепш, чым паўнавартасным народам з уласнай моваю, гісторыяй і культураю, тым больш што і свая мова, і культура, і гісторыя — ёсьць? Няўжо быць у рэальнасьці крывым, няздатным і хворым, а таму — ізгоем сярод краін-суседак — лепш, чым перастаць уласную нацыянальную годнасьць лічыць такой крывой, няздатнай і хворай? І тады — быць самадастатковым, як тыя латышы, літоўцы, палякі, расейцы ды ўкраінцы?

За часамі Лукашэнкі ўсё нацыянальнае ў Беларусі адчувала на сабе такі прэсінг дзяржавы, што казаць пра аб'ектыўныя законы разьвіцьця нацыі ў гэты пэрыяд нагул не выпадае. Каб сьцьвярджаць, што беларушчына «страціла свой гістарычны шанец», трэба прынамсі на нейкі час перастаць стаяць ёй каленкай на горле, выпусьціць яе зь цёмнага сырога падвалу... Я ўжо не кажу пра падтрымку з боку дзяржавы, як гэта ёсьць ва ўсім сьвеце. Думаю, яна абышлася б і бяз гэтага. Абы ёй хоць раз у гісторыі далі шанец, паслухалі яе дыханьне, а ўжо тое, што прыгожая, прыдатная і жывая, яна дакажа сама.

**Сяргей Дубавец**

## Прыярытэты АН: нанатэхналёгіі й вадарод

Прыярытэтнымі кірункамі дасьледаваньняў беларускіх навукоўцаў сёлета будуць вадародная энэргетыка, а таксама нанатэхналёгіі й нанаматэрыялы. Акадэмік Сяргей Жданок лічыць, што навукоўцы ў хуткім часе змогуць вырабляць да некалькіх кіляграмаў нанаматэрыялаў у гадзіну. Адзін грам вугляродных нанатрубак каштуе на сусьветным рынку да 100 даляраў. У сьвеце нанатэхналёгіі лічацца вельмі пэрспэктыўнымі: краіны NATO інвэстуюць у гэтую сфэру каля 2 млрд даляраў штогод, і гэтая лічба ў бліжэйшыя гады мае вырасьці да 3 млрд.

Дасьледаваньні вадароднай энэргіі будуць праводзіцца ў рамках дзяржаўнай праграмы «Вадарод». Летась былі створаныя першыя беларускія энэргетычныя агрэгаты, у якіх хімічная энэргія ператвараецца ў электрычную. Апроч таго, навукоўцы працягваюць працу над стварэньнем касьмічнага спадарожніка, зьбіраюцца адчыніць Акадэмічны ўнівэрсытэт.

**АШ; БелаПАН**

**Рэпартаж з 75-годзьдзя Акадэміі і гутарка з прафэсарам Грыцкевічам — старонка 4.**




ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Прыкольны сэрыял «Дыктатура»



7 студзеня францускі часопіс «Parade» надрукаваў сьпіс дзесяці найгоршых дыктатараў сучаснасьці. Дыктатары, як сказана ў тэксьце, прайшлі кастынг уплывовых міжнародных праваабарончых структураў. У чорным лісьце францускага часопісу Аляксандар Лукашэнка закрывае дзясятку, саступаючы прынцу Абдулу, Тан Швэ, Кім Чэн Іру і іншым ворагам чалавецтва.

Першая думка ад прачытанага: наколькі прэстыжным лічыцца трапіць у дзясятку «Parade» у асяродзьдзі дыктатараў? Напрыклад, наш Лукашэнка заняў дзясятае месца, відавочна абагнаўшы на некалькі пунктаў іншага калегу, які прыйшоў адзінаццатым. Якому-небудзь афрыканскаму князьку з Тумбы-Юмбы не хапіла пары забароненых прафсаюзаў, каб апынуцца ў кампаніі з самім Фідэлем. А які быў шанец!

Самае сьмешнае, што «Parade» — звычайны жоўты папірус. Артыкул аб жудасных дыктатарах надрукаваны побач з нататкамі аб тым, як прынцэса Дыяна сьпявае «Бітлз» у магіле, а Брытні Сьпірс дзеліць ложак з бэн Ладэнам. Чытаюць «Parade» звычайныя хатнія гаспадыні і пасажыры экспрэсу TGV, каб забіць час.

Барацьба за правы чалавека ў капіталістычным сьвеце стала звычайным таварам, набыла сваё месца на мэдыя-рынку, у сыстэме густаў заходняга спажыўца. Гэта цікавей, чым лох-нэская гадзіна, але ня так прыкольна, як сэксуальныя прыгоды Ды Капрыё. Яшчэ цікавей тое (аб гэтым сьведчыць рэзананс, які меў у Беларусі артыкул з «Parade»), што густы спажыўцоў здольныя ўплываць на паводзіны палітычных актораў у краінах капіталістычнай пэрыфэрыі, у той жа Беларусі.

Гэта цікавей, чым лох-нэская гадзіна, але ня так прыкольна, як сэксуальныя прыгоды Ды Капрыё.

Барацьба за дэмакратыю ў Беларусі ўспрымаецца на Захадзе як доўгі, але досыць прыкольны сэрыял «Дыктатура», дзе добрыя дэмакраты з «Народнай кааліцыі» без канца супрацьстаяць містэру «Зло» Лукашэнку. Адначасова сэрыял рэтрансьлююць на Ўсход, дзе, як вынік дывэрсыфікацыі працэсу глябалізацыі, Лукашэнка ўспрымаецца станоўча, а апазыцыянэры — адмоўна. У любым выпадку на дыктатуру ёсьць попыт.

Беларускія палітыкі несьвядома паводзяць сябе як культурны тавар на заходніх і ўсходніх мэдыя-рынках, як акторы сэрыялу. Іх першае заданьне не выходзіць за рамкі жанру «добры супраць дрэннага». Невясёлае рэзюмэ — пакуль чытачу «Parade» не абрыдне чытаць пры жахі дыктатараў, апошнія нікуды ня зьнікнуць.

Затое нас чакаюць забойныя «конкурсы дыктатараў» — апошняе слова ў шоў-бізнэсе. З добрым мэнэджэрам і нармальным спонсарам, напрыклад «Nike» або «Газпром», імпрэзу можна арганізаваць вельмі відовішчную. Вялікі хол. Маса журналістаў. Увесь праваабаронччы бамонд. На подыюме — дэфіле ахвяраў дыктатараў, якія дэманструюць сябрам журы сьляды катаваньняў. Конкурс купальнікаў, белы танец з праваабаронцамі, каранацыя... Гэта будзе круцейшым за «Вялікае мыцьцё».

**Лёлік Ушкін**

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Дзе цяпер Эўропа



Пачуў новую тэзу клясыка апазыцыі: маўляў, цяпер мы — Эўропа, а «той» Эўропы, лічы, ужо няма. Спрачацца ня буду, безь мяне спрачальшчыкі знойдуцца, а цягне тую думку разьвіць на практычным узроўні...

Мае ўражаньні ад візытаў на Захад ды ад візыцёраў з Захаду можна выказаць бяз словаў, адно пахітваньнем галавой і ўздыхамі. Краі-мары спакваля аказваюцца краямі-пудзіламі, і тое, што ўчора камэнтаваў бы «Адназначна!», сёньня адзначыш хіба словамі «Ня ведаю…». Традыцыя Старога Сьвету лопнула пад цяжарам веку і разьляцелася па зямлі.

Вось Турцыя. Едуць да нас прадпрымальнікі і мэнэджэры адтуль, нясуць відавочна эўрапейскую бізнэс-культуру. Ад атрыбутыкі і стылю: кашуля, гальштук, гадзіньнік, брытанская ангельская — да пісьменнасьці й ветлівасьці, парадку ў працы, падыходу да мэтазгоднасьці й рызыкі. Дык мо цяпер Эўропа ў Турцыі?

Вось Кітай, Шанхай. Штогадовыя выставы вытворцаў, якія раней ладзіліся пераважна ў Нямеччыне. Не дзясяткі, а сотні хмарачосаў. Цяжка нават уявіць сабе паперку на ходніку, які ня тое што памыты, а й блішчыць. Шкло і сталь, нэон і кандыцыянаванае паветра. Горад-офіс, дзе ўсё па-ангельску: ад рэклямы і гутаркі на вуліцы да аўсянага сьняданку ў гатэлі. Мо ў Кітаі Эўропа?

Пачуў новую тэзу клясыка апазыцыі: маўляў, цяпер мы — Эўропа, а «той» Эўропы, лічы, ужо няма.

Вось Беларусь. Праз сваю ізаляванасьць і беднасьць яна аказалася амаль некранутаю ні вялікімі перасяленьнямі, ні сусьветнай распустай, ні спажывецкай ліхаманкай. Адсталасьць сёньня можа стаць гарантыяй выбару найвыгаднейшага культурнага шляху заўтра, абаронным купалам нашае самабытнасьці і цноты. Ці скарыстаем мы з гэтага? Ці падбяром сабе аскепачак «тае» Эўропы?

**Вацлаў Заякоць**



Генадзь Бураўкін Алегу Трусаву: «У падпольле, браце?»

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Пайшлі бамбіць

**Таварыства беларускай мовы пазбаўляюць сядзібы. Моваабаронцы пратэстуюць.**

ЖРЭА Партызанскага раёну Менску паведаміла тэбээмаўцам, што не працягне кантракту на арэнду офісу на вуліцы Румянцава, 13. У ЖРЭА цьвердзяць, што памяшканьне патрэбна для дадатковага разьмяшчэньня службаў ЖЭСу №12. Тэрмін арэнды сканчаецца 4 сакавіка.

Алег Трусаў, старшыня ТБМ, зьвязвае рашэньне ЖРЭА з будучымі выбарамі ў парлямэнт: «Арганізацыя актывізавалася за апошнія месяцы. У нас актыўна зьбіраюцца складкі, чаго няма сёньня ні ў адной палітычнай партыі. Людзі сотнямі ўступаюць у ТБМ: у адных толькі Стоўпцах у нас 500 сяброў. Гэтая нашая актыўнасьць і ўстурбавала ўлады». Не адмаўляе Трусаў і «ліцэйскага сьледу»: ТБМ актыўна дапамагала гнаным коласаўцам. Але вызначальнай гэтую прычыну ён ня лічыць: «Вядома, сытуацыя зь Ліцэем паўплывала, але не яна стала вырашальнай». Як ня стаў вызначальным і ціск, які ТБМ аказвае на Канстытуцыйны Суд ды іншыя дзяржаўныя структуры, адстойваючы ў іх правы беларускай мовы.

На думку кіраўніка ТБМ, сытуацыя зь яго арганізацыяй — гэта толькі пачатак чарговых масавых «зачыстак»: «Я маю інфармацыю, што пасьля нас возьмуцца за іншых. Улады ня хочуць, каб у цэнтры гораду сядзелі апазыцыя й інтэлігенты. З нас заўжды пачынаюць. Нам год таму Мінюст выпісаў папярэджаньне, якое мы абскарджвалі ў судзе. Потым па «нашай» схеме зачынялі іншыя грамадзкія арганізацыі».

На сядзібе ТБМ зарэгістраваныя тры арганізацыі (Партызанская раённая, гарадзкая, рэспубліканская) і дзьве газэты («Новы час» і «Наша слова»). Высяленьне азначае фактычную іх ліквідацыю. Іншага памяшканьня камунальныя службы не прапанавалі: маўляў, няма. Трусаў зьбіраецца шукаць запасны варыянт — аж да сыходу ў падпольле, — але ўсё ж спадзяецца на пазытыўнае вырашэньне праблемы: «Чыноўнікі цяпер ставяцца да нас зусім іначай, чым год таму: у прыватных гутарках вельмі спачуваюць і спадзяюцца на нашую перамогу. Вераць, што мы застанёмся па старым адрасе».

Апрача таго, старшыня ТБМ мяркуе распачаць шырокую інфармацыйную кампанію: «Будзем падымаць народ — зьбіраць подпісы ў абарону ТБМ, а потым пойдзем зь імі да мэра Паўлава».

Таварыства беларускай мовы — адзіная падобная арганізацыя ў Эўропе, якая існуе безь дзяржаўных датацый. Усе астатнія хаўрусы, што змагаюцца за правы і разьвіцьцё нацыянальных моваў, у тым ліку і Таварыства ўкраінскай мовы ў нашых суседзяў, маюць дзяржаўную падтрымку.

**Аркадзь Шанскі**

# Ліцэй назаўжды

## Навучэнцы і выкладчыкі Ліцэю сьвяткавалі ў двары, не занялі будынку

14 студзеня навучэнцы й выкладчыкі Беларускафга ліцэю сабраліся пад мурамі сваёй alma mater па вул. Кірава. Яны ў чарговы раз адзначылі Дзень Ліцэю. У гэты дзень 12 гадоў таму будынак быў перададзены навучальнай установе пастановай Саўміну. Агулам жа Ліцэй адзначыў свой 14-ы дзень нараджэньня.

Намесьнік дырэктара Лявон Баршчэўскі згадваў першыя гады існаваньня Ліцэю. Як прэм’ер Кебіч не хацеў ставіць апошні подпіс для перадачы Ліцэю будынку на вул.Кірава і пагадзіўся на гэта, калі бацькі й вучні ўжо самі занялі будынак. Кіраўнік Ліцэю Ўладзімер Колас зазначыў, што ліцэісты з выкладчыкамі маглі б заняць будынак, як зрабілі гэта ў 92-м: «Але мы будзем трымацца ў рамках закону».

Будынак, зь якога ліцэістаў выкінулі на падставе рамонту, дагэтуль стаіць пусты. Ніякія рамонтныя работы тут не вядуцца. Намесьніца дырэктара Ірына Сідарэнка, якой удалося прайсьці ў былы свой кабінэт, кажа, што ўнутры ўсё засталося некранутым: «На сьценах зь лета вісяць нашыя віншаваньні выпускнікам, у маім кабінэце ляжаць сшыткі з творчымі працамі».

Сёньняшняе сьвяткаваньне Дня Ліцэю прыпала на апошні дзень вакацыяў, якія ў ліцэістаў пачаліся й скончыліся пазьней, чым у іншых школах, бо месяц дзеці вучыліся ў Вільні. У нармальных умовах рабілі лябараторныя працы па хіміі, фізыцы, займаліся фізкультурай у спартзалі. Урэшце пабылі ўсе разам і зноў адчулі сябе калектывам. Вярнуліся ў Менск толькі 3 студзеня.

Але скончыўся і гэты кароткі адпачынак. Л.Баршчэўскі нагадаў, што для вучняў 2-га й 4-га курсаў наступнае паўгодзьдзе будзе надзвычай складаным: трэба рыхтавацца да здачы дзяржаўных іспытаў.

Сьвята Ліцэю мае працягвацца. 15 студзеня ліцэісты зьбяруцца ў ліцэйскім дворыку, каб запусьціць у неба сьвяточныя балёнікі, а потым правядуць чарговую сьпеўную акцыю на праспэкце Скарыны. 16 студзеня ўвечары ў менскім клюбе «Тунэль» адбудзецца сьвяточная вечарына з паказам ліцэйскай кінахронікі й дыскатэкай.

«НН» далучаецца да віншаваньняў.

**Аркадзь Шанскі**

## Дык падпісвайся!

Падпісацца на «НН» можна на любой пошце. У Менску таксама прымаецца **падпіска на шапікі «Белсаюздруку»** або праз прыватныя сыстэмы дастаўкі **«Эй Бі ПрэсСэрвіс» і «Рэм-Інфо»**. «Наша Ніва» — крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. Падпісны індэкс 63125.

# Не разлюбі сваёй дзяржавы

Дыктатура — гэта ня толькі адсутнасьць палітычных свабодаў. Дыктатура — гэта перш за ўсё хвароба грамадзкіх адносінаў, распад сувязяў паміж людзьмі, узвышэньне пасрэднасьцяў, усёдысная крывадушнасьць, а перадусім, мабыць, спалучэньне паскудзтва зь няякаснасьцю.

**Лёба Антунэш, партугальскі пісьменьнік, які пiша пра 40-гадовае (1928—1968) панаваньне Салязара.**

Пад Новы год газэты дружна падводзяць вынікі году. Цяжка выбраць самую значную падзею ці найлепшы фільм. А вось з найбольшай подласьцю году не было б ніякай праблемы. Яна адбылася ў часе пахаваньня Быкава. Калі даішнікам загадалі запыняць сустрэчныя аўтамабілі, каб ня збочвалі з праспэкту Скарыны налева. Каб ствараць канфлікты і — хто ведае — мо нават справакаваць нейкую аварыю. Калі несьлі Быкава. Быкава!..

І заварочвалі даішнікі машыны, адводзячы вочы. Толькі каму цікава чытаць пра найбольшую подласьць году?

Год для незалежных газэтаў пачаўся зь ліста Беларускага тэлеграфнага агентцтва. «УП «БЕЛТА» получило эксклюзивное право на распространение программ телепередач на территории Республики Беларусь белорусских телеканалов. С 5 января 2004 г. публикация телепрограмм белорусских телеканалов производится исключительно на основании договоров с УП «БЕЛТА». В случае нарушения данных условий виновные будут привлекаться к ответственности в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

А словы якія! Эксклюзіўнае права! Віноўныя будут прыўлякацца! Сумесь маскоўскіх пантоў з сталінскай казармай.

«У нас каштуе 5 мільёнаў 025 тысячаў. Пытаньне пра скідкі вырашаецца ў індывідуальным парадку камэрцыйным дырэктарам», — адказвае дамачка ў БелТА. Нам удалося высьветліць, якую «зьніжку» робяць дзяржаўным газэтам. Аднаму з агульнанацыянальных таблёідаў праграма каштавала 50000 рублёў. Як Вам зьніжачка — 99%?

У Расеі пытаньне платы за тэлепраграму было аб’ектам судовае спрэчкі, якая скончылася рашэньнем, што на тэлепраграму ніхто ня можа мець аўтарскіх правоў. Сам факт выбіваньня грошай за хронамэтраж перадачаў юрыдычна сумнеўны. А цана 2400 даляраў і 99%-я зьніжкі, якія дае «камэрцыйны дырэктар», — гэта проста каб задушыць рэгіянальныя незалежныя газэты, якія раскупляюць і дзеля праграмы, якасна пададзенай, у тым ліку.

«НН» у гэтым нумары праграму яшчэ друкуе, бо пакуль цэны БелТА ня ўзгодненыя зь Міністэрствам эканомікі. З наступнымі ж нумарамі застаецца няяснасьць.

Як высьветліла «Белорусская газета», ТВ-праграму манапалізавалі ў выніку рашэньня калегіі Адміністрацыі прэзыдэнта ад 27 кастрычніка. Усё ідзе па пляне: праз два месяцы пазбаўляем газэты ТВ-праграмы, праз тры выганяем ТБМ, праз чатыры зачыняем… празь пяць разганяем… Пра тое, што год адзначыцца нейкай асабліва важнай палітычнай кампаніяй, беларускія палітолягі дазнаюцца вось па такіх рысках — «мерах па ўдасканаленьні», так бы мовіць.

Людзі ва ўладзе ня могуць зразумець, чаму Пургурыдэса абурыў той факт, што ягоныя размовы праслухоўваліся. Ну і што тут такога? Кожнага з нас праслухоўваюць, і нічога. Я нават магу сабе ўявіць, як пацепваюць плячыма ружавашчокія міністры.

Гэта праўда — Беларусь выглядае брыдкай у вачах замежнікаў. Крайнай нефункцыянальных аэрапортаў і аўтавакзалаў, нясьвежых абедаў, цынічных палітыкаў і некампэтэнтных чыноўнікаў. Sorry, забыўся, — і чыстых вуліцаў. Ды каб навучыцца вуліцы вымятаць, шмат розуму ня трэба. Брыдкая краіна, калі ў ёй найбольшую подласьць году ўчыняюць улады.

Чытаю паўтарагадовай даўніны прагнозы аналітыкаў ангельскага «Эканамісту» пра сытуацыю ў Беларусі. Заходнікі няздольныя прадказаць посьпехі нашай эканомікі. А галоўнае спраўджваецца: «Як і ў першы тэрмін свайго кіраваньня, сп.Лукашэнка будзе дамінаваць на палітычнай сцэне, абапіраючыся на органы бясьпекі і ўнутраных справаў, душачы дэмакратычную апазыцыю і запалохваючы вышэйшых чыноўнікаў…»

Агіда, злосьць, крыўда — нармальныя рэакцыі на тое, што адбываецца з краінай. І ўсё ж — гэта наша дзяржава, наша краіна, нашы чыноўнікі, наша тэлебачаньне і нават у пэўнай ступені наш прэзыдэнт. Якія ёсьць. Айчына ў гэтым сэнсе — яна як маці. На яе і злуеш, і, бывае, лаешся, і не разумееш, і дзівуешся яе ўпартасьці, і зьмяніць ня можаш. Але ж не адракаешся. Агіда да чыноўнікаў і крыўда на іх не павінны пераходзіць у агіду да айчыны і здраду ёй. Паскудствы перамелюцца, вартае застанецца, і калісьці жыцьцё пойдзе наноў.

Успамінаю тую подласьць году… Прылятаў Чаргінец, крычаў на Бураўкіна: «Ды я цябе!.. Ніякіх сьцягоў, ніякага нашэньня, я сказаў!» Разьлічваў, што зьбярэцца жменька людзей, як 20 гадоў таму на пахаваньне Караткевіча. А прыйшлі тысячы, і несьлі Быкава на магілкі на руках, і не дзьвярамі да ін’язу, як загадваў Чаргінец, а праз плошчу Перамогі. Па праве моцнага. Рэсурс уплыву айчыннасьці на грамадзтва вялікі, але не бясконцы. Акурат такі, які грамадзтва ёй дазваляе. Гэта як з камунальнымі плацяжамі: па 60 тысяч людзі плацяць, закруцілі б па 100 — пайшлі б на вуліцы.

Усяго не прыкрыюць, усіх не пратруць. Не дазволяць друкаваць тэлепраграму — сапраўдныя чытачы не перастануць ад гэтага чытаць сапраўдныя газэты, не абыдуцца «Ва-банкам». Забяруць сядзібу ў ТБМ — ад гэтага людзі не перастануць маліцца за мову. І за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу.

**Барыс Тумар**

# Праблема зьнішчэньня інтэлекту

## Акадэміі навук 75 гадоў

На ўрачысты сход з нагоды 75-годзьдзя Нацыянальнай акадэміі навук было цяжка прабіцца. 9 студзеня ў залю пасяджэньняў НАН супрацоўнікаў навуковых інстытутаў сагналі пад прымусам, бо баяліся, што добраахвотна ня пойдзе ніхто. У выніку не ставала сядзячых месцаў нават чальцам-карэспандэнтам, і многія сыходзілі адразу.

Сьвяткаваньне нагадвала замшэлы савецкі сход: шмат адпаведнай лексыкі ў прамовах, падарункаў і пэнсіянэраў у зале. Прэзыдэнт Акадэміі Міхаіл Мясьніковіч казаў, што навукоўцы «выйшлі з гушчы народных масаў», але згадаў, што сама Акадэмія ўсё ж выйшла з Інбелкульту.

Навуковую ўстанову зь юбілеем віншавалі ледзь ня ўсе міністры асабіста.

Амаль усе міністэрствы й ведамствы ўручалі ганаровыя граматы супрацоўнікам «сваіх» інстытутаў. Грамату ад Мінадукацыі атрымаў прафэсар Міхась Тычына, выкладчык Беларускага ліцэю й супрацоўнік Інстытуту літаратуры.

Прадстаўнікі Нацыянальнага алімпійскага камітэту паўтаралі, што толькі з дапамогай Акадэміі спадзяюцца заваяваць 25 алімпійскіх мэдалёў. Мо ў Акадэміі распрацаваны нейкі супэрсучасны допінг, як ня выявіць аніякі тэст?.. Апроч таго, спартоўцы ўзнагародзілі Мясьніковіча мэдалём камітэту й пабацалі ордэн пасьля Алімпіяды.

Міністар абароны Леанід Мальцаў па-вайсковаму падкрэсьліў значнасьць Акадэміі — сказаў, што яна знаходзіцца «на передавой», а таксама загадкава абмовіўся: «У сучасных умовах праблема зьбіраньня й зьнішчэньня нацыянальнага інтэлекту становіцца ключавой».

Сымптаматычна абгаварыўся й міністар жыльлёва-камунальнай гаспадаркі Ўладзімер Белахвостаў: «Мы хочам, каб у кожным кабінэце зьявілася карціна, якую мы, ня доўга думаючы, выбралі». Карцінаў падарылі сапраўды шмат — цяпер Акадэмія можа адчыняць уласны мастацкі салён. Апроч карцінаў дарылі вазы, кампутары, грошы.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сьвяткаваньне нагадвала заімшэлы савецкі сход: шмат адпаведнай лексыкі ў прамовах, падарункаў і пэнсіянэраў у зале. Прэзыдэнт Акадэміі Міхаіл Мясьніковіч казаў, што навукоўцы «выйшлі з гушчы народных масаў», але згадаў, што сама Акадэмія ўсё ж выйшла з Інбелкульту.**

Грашовыя падарункі заля ўспрымала з найбольшым зацікаўленьнем. Таму падарунак ад Мінэнэргетыкі ў 25 млн руб. выклікаў узьдых расчараваньня: ад «Белтрансгазу» навукоўцы спадзяваліся на большае. Нават Гомельскі аблвыканкам падарыў Акадэміі на 5 млн болей (праўда, з умовай — пабудаваць ці купіць кватэру навукоўцу з Інстытуту радыебіялёгіі, які пераехаў у Гомель).

Былі й зусім арыгінальныя падарункі. Міністар па надзвычайных сытуацыях падарыў шлем выратавальніка: «Айчынная распрацоўка. Ён такі трывалы, што нават ад галавы ў ім нічога можа не застацца, а шлему нічога ня зробіцца». Можна апранаць на сэлектарныя нарады.

Ад Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя навукоўцам падарылі калекцыю карысных выкапняў Беларусі. Рэктарка Ўнівэрсытэту культуры Ядвіга Грыгаровіч прэзэнтавала ручны тканы габэлен «Успамін Слуцку»: «Мы нават месца для яго нагледзелі: каля кабінэту Мясьніковіча ёсьць калёна, якая вельмі пасуе ў тон гэтаму габэлену». Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт транспарту спрэзэнтаваў дзейную мадэль лякаматыва. А пасьлы пераважна паўлічвалі фонды акадэмічнай бібліятэкі: расейскі — «Хронікай чалавецтва» й іншымі кнігамі, латвійскі — двухтомнікам, прысьвечаным латыскаму нацыянальнаму касьцюму, польскі — мастацкім альбомам.

Дарма што а 10-й у залю было не прабіцца, пасьля 13-й засталася хіба чвэрць гледачоў. Канца цырымоніі дачакалі лічаныя адзінкі — ляўрэаты, якія атрымлівалі ганаровыя дыплёмы й граматы, ды само кіраўніцтва Акадэміі, якое гэтыя граматы ўручала.

**Аркадзь Шанскі**

# Анатоль Грыцкевіч: Акадэмію прывязаць да карпарацый


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**У сьвяточны для Акадэміі год доктар гістарычных навук, прафэсар Анатоль Грыцкевіч сьвяткуе асабісты юбілей. Шаснаццаць гадоў зь сямідзесяці пяці ён адпрацаваў у Інстытуце гісторыі АН. Акадэмія была сталінскім дзіцем, пакліканым узяць пад кантроль навукоўцаў і прымусіць іх працаваць выключна пад дзяржзаказ. А цяпер? А заўтра? Пра сёньняшні стан акадэмічнай навукі з сп.Грыцкевічам гутарыць карэспандэнт «НН».**

**Анатоль Грыцкевіч:** Рэфармаваньня Акадэміі два гады таму як такога не было. «Рэформа» мела на мэце ўзяць пад поўны кантроль усю навуку і навукоўцаў ды атрымліваць ад Акадэміі большы прыбытак. Цяперашняя навуковая адміністрацыя робіць стаўку на прыкладную навуку, «практычную». Дзеля гэтага рэформа й праводзілася. А тэарэтычная навука, як заўсёды, будзе на другім пляне.

**«НН»: А як супрацоўнікі паставіліся да кантролю з боку ўлады?**

**А.Г.:** Наколькі я ведаю, яны былі задаволеныя, бо спадзяваліся, што будзе больш грошай. Так што заменай выбарнага прэзыдэнта на прызначанага ўся рэформа й абмежавалася.

**«НН»: Міхаіл Мясьніковіч на юбілейным сходзе зазначыў, што цяпер навукоўцы вяртаюцца з-за мяжы ў Беларусь, у прыватнасьці — у Акадэмію.**

**А.Г.:** Я ня ведаю такіх выпадкаў. Тыя, хто на Захадзе ўладкаваўся (а ўладкавацца там можна, асабліва работнікам тэхнічных спэцыяльнасьцяў, калі яны маюць здольнасьці), там і застаюцца. Там лепшыя ўмовы для экспэрымэнтаў, лепшая тэхнічная база, болей магчымасьцяў надрукавацца. Надрукавацца — гэта таксама важна: цяпер жа не XVIII ст., калі навуковец мог працаваць толькі дзеля сваёй цікавасьці.

**«НН»: У 90-я моладзь практычна не ішла ў навуку. Ці большае сёньня маладых навукоўцаў?**

**А.Г.:** Я не заўважаю, каб маладых навукоўцаў станавілася нашмат болей. Тыя, хто займаецца тэхнічнымі навукамі, ідуць, бо спадзяюцца рэалізаваць свае ідэі. А гуманітарыяў ня так і шмат... Калі нехта й ідзе, дык таму, што бізнэсам стала займацца небясьпечна — ніякіх пэрспэктываў. А працаваць недзе трэба. Дык тут можна хоць нейкую навуковую ступень атрымаць, заняць пасаду.

**«НН»: Што патрэбна для нармальнага разьвіцьця акадэмічнай навукі?**

**А.Г.:** Па-першае, нармальная эканоміка, якой у нас пакуль няма. Па-другое, іншая палітыка ў дачыненьні да навукі. Пакуль што ўладам патрэбная прыкладная навука: мэтадалёгія й тэарэтычная навука ім мала цікавыя. Таму для выкананьня вельмі часта бяруцца кароткія тэмы — каб найхутчэй атрымаць вынік, грошы.

**«НН»: Тая ж Японія жыве без акадэмічнай навукі, на адных тэхналёгіях, якія яны купляюць. Чаму ў нас нельга так арганізаваць?**

**А.Г.:** У іх разьвітая патэнтная сфэра. У нас жа арганізацыя навукі вельмі адсталая — савецкая, строга структураваная. Багата начальства: Прэзыдыюм Акадэміі, аддзяленьні па розных галінах навукі, інстытуты, у іх аддзелы, часам аддзелы падзяляюцца на нейкія групы. Гэта як войска: пакуль загад дойдзе, ён пачынае выконвацца зусім інакш.

**«НН»: А якой павінна быць структура акадэмічнай навукі?**

**А.Г.:** Больш свабоднай. Безь вялікай колькасьці ўстановаў: дзясяткі інстытутаў — гэта зашмат. Можна было б, як у іншых краінах, рабіць акадэміі ці навуковыя аб’яднаньні разам з прамысловымі карпарацыямі. Карпарацыі маглі б фундаваць работнікаў тэхнічных навук, а гуманітарам, бёлягам давала б грошы дзяржава. Былі ж у нас Акадэмія тэхнічных навук, Акадэмія сельскагаспадарчых навук... Яны ёсьць і цяпер, але гэта хутчэй грамадзкія аб’яднаньні.

**«НН»: Аднак карпарацыі таксама будуць скіроўвацца на распрацоўку кароткачасовых тэмаў, якія будуць даваць як мага хутчэйшую аддачу.**

**А.Г.:** А цяпер што? Хіба інача́й? Тое самае, толькі з боку дзяржавы. На Захадзе нават у навукова-дасьледчых інстытутах, якія фундуюцца карпарацыямі, вядуцца тэарэтычныя распрацоўкі. Дзякуючы фінансавым магчымасьцям там шмат робіцца для мэтадалёгіі, што вельмі важна: аднаго апісаньня фактаў недастаткова.

**Гутарыў АШ**



Павал Севярынец: «За нашымі сьпінамі — бел-чырвона-белы сьцяг і беларуская гісторыя». Зьлева — Мікола Арцюхоў, у цэнтры — Алесь Зарамбюк.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# «Маладая Беларусь»

## ня хоча падносіць снарады

**Мэту блёку яго лідэр Павал Севярынец акрэсьліў так: «нанясеньне псыхалягічнай паразы рэжыму яшчэ перад прэзыдэнцкімі выбарамі». Праграмы блёк пакуль ня мае.**

Аснову новага блёку склалі сябры «Маладога фронту». «Маладая Беларусь» зьяўляецца аб'яднаньнем асобаў, якіх пакуль налічваецца дваццаць сем. Аднак пэрсаналіі П.Севярынец называць адмовіўся, палічыўшы гэта передчасным. У прэзэнтацыі блёку, якая адбылася ў панядзелак, бралі ўдзел Мікола Арцюхоў (БСДГ), Сяргей Бахун (БНФ, Берасьце), дэпутат з Мастоў Алесь Зарамбюк, Павал Севярынец ды Віктар Шляхцін (БНФ, Віцебск). Яны спадзяюцца да выбараў сабраць у «Маладую Беларусь» яшчэ некалькі дзясяткаў чалавек. Зрабіць гэта будзе няпроста, бо многія вядомыя асобы заангажаваныя ў іншыя кааліцыі й наўрад ці рызыкнуць далучыцца да новай, у якой пакуль яшчэ няпэўная будучыня.

Утварэньне моладзевага блёку, на думку П.Севярынца, прывядзе да ўзрастаньня канкурэнцыі паміж рознымі кааліцыямі, да павышэньня «здольнасьці і якасьці змаганьня». А галоўнае — «Маладая Беларусь» хоча даць людзям «маладую альтэрнатыву», не запляміленую ў «міжасабовых разборках» і не адказную за паразы апазыцыі.

Апярэджваючы закіды ў раскольніцкай дзейнасьці, Севярынец абяцае, што кансультацыі з Эўракааліцыяй «Свабодная Беларусь» і «Пяцёркай-плюс» будуць весьціся і надалей. У першым туры выбараў у палату прадстаўнікоў «Маладая Беларусь» ня будзе крытыкаваць дэмакратычных кандыдатаў, у тым ліку і камуністаў — удзельнікаў «Пяцёркі-плюс». Дарэчы, і сам моладзевы блёк ідэалягічна неаднародны, бо ў яго ўвайшлі і левыя, і правыя.

А вось незарэгістраваная моладзевая арганізацыя «Зубр» не зьбіраецца далучацца да «Маладой Беларусі». Зубры па-ранейшаму выступаюць за стварэньне адзінай дэмакратычнай кааліцыі.

Передвыбарчы блёк «Маладая Беларусь», верагодна, стартаваў сьпешна, бо дагэтуль працуе над сваёй праграмай. Ва ўлётцы «Што такое «Маладая Беларусь», якую атрымалі журналісты, зьмешчаныя толькі агульныя тэзісы. Напрыклад, «Маладая Беларусь» — гэта сіла... гэта свабода... гэта пэрспэктыва...». Алесь Зарамбюк кажа, што «кожны з кандыдатаў, акрамя асноўных прынцыпаў блёку, будзе мець яшчэ і сваю праграму, арыентаваную на мясцовыя праблемы ў тым рэгіёне, дзе будзе абірацца».

Адказваючы на пытаньне пра фінансаваньне блёку, Севярынец намякнуў, што знайшліся людзі, якія іх падтрымалі. «Гэта беларускія грошы», — сказаў ён. Дарэчы, Севярынец, які раней адмаўляў свой удзел у выбарах у палату, абвесьціў, што наважыўся ўсё ж паспрабаваць свае сілы.

«Маладыя беларусы» кажуць, што ня хочуць «падносіць снарады» старэйшым сябрам. Яны лічаць, што ўжо вырасьлі для сур'ёзнай і самастойнай палітыкі. «Калі пройдуць выбары, вы ўбачыце, што мы зь сябе ўяўляем», — сказаў Алесь Зарамбюк. Вядома, пабачым. Але хочацца верыць, што моладзь кіруецца цьвярозым палітычным разьлікам, а не эмоцыямі. Бо часткова менавіта такое ўражаньне склалася пасьля прэзэнтацыі. Алесь Зарамбюк казаў, што апазыцыя «нас адмаўляе як будучых лідэраў», недаацэньвае патэнцыял і здольнасьці. А кіраўнік віцебскіх франтоўцаў Віктар Шляхцін паскардзіўся на кіраўніцтва Партыі БНФ, якое нібыта прапанавала яму сысьці з пасады, бо ён працаваў на выбарах у Расеі. Дзьвярыма, вядома, можна стукнуць, але ў магчымасьць стварэньня ў палаце фракцыі «Маладой Беларусі» сёньня паверыць хіба самы вялікі аптыміст. Фактычна можа атрымацца так, што невялікіх рэсурсаў новага блёку хопіць толькі на збор подпісаў за некалькіх кандыдатаў.

**Сяргей Ёрш**

# Няма чаго адказаць

**10 студзеня скончыўся тэрмін, да якога чакаў адказу беларускіх уладаў дэпутат ПАРЭ Хрыстас Пургурыдэс, дакладчык у справе зьнікненьняў у Беларусі.** У сваім мэмарандуме ён патрабаваў адстаўкі генпракурора Шэймана і аб'ектыўнага вышуку ў справе зьніклых палітыкаў і журналістаў. Улады палічылі за лепшае прамаўчаць. «Уладзімер Канаплёў ня мае дадзеных па гэтым пытаньні», — адказала карэспандэнту «НН» памочніца віцэ-сьпікера палаты прадстаўнікоў.

Пургурыдэс лічыць, што цяпер ПАРЭ магла б заклікаць міжнародную супольнасьць арганізаваць палітычны ціск на кіраўніцтва Беларусі праз санкцыі. З усіх прапаноў Пургурыдэса рэальна могуць распачацца працэсы супраць беларускага кіраўніцтва ў некалькіх краінах, дзе законы прадугледжваюць міжнародную юрысдыкцыю нацыянальных судоў. Хрыстас Пургурыдэс працуе над тэкстам канчатковай справаздачы. На ягоную думку, яна можа стаць палітычнай бомбай. Юрыдычны камітэт ПАРЭ мае абмяркоўваць яе пры канцы студзеня. Прыкладна тады ж у нашу краіну прыедзе «тройка» прадстаўнікоў эўрапейскіх арганізацый у складзе Уты Цапф, Ёнаса Чэкуоліса, Яна Вірсмы.

Адносіны Беларусі з Эўропай працягваюць пагаршацца. Эўракамісія разьбіраецца ў справе парушэньня працоўных правоў беларусаў. А Ганс-Георг Вік заклікаў эўрапейскія інстытуцыі спыніць кантакты з урадам Лукашэнкі, «якому немагчыма давяраць», і распачаць дапамогу незалежнаму беларускаму грамадзтву.

**АТ**

# Байкот,

## яшчэ байкот



Зянон Пазьняк у сваім дакладзе, дасланым на сойм КХП-БНФ, заклікаў беларусаў ня йсьці на выбары, а арганізаваць «асэнсаваны ўсеагульны байкот». На ягоны погляд, перашкодзіць фальсыфікацыі можна толькі такім чынам. Пазьняк стаіць на старым варыянце байкоту «нелегітымных выбараў», а пасьля — арганізацыі выбараў легітымных, пад «міжнародным пратэктаратам». Толькі кансэрватары пакуль нічога ня робяць, каб да байкоту далучаліся іншыя партыі. У гэтым бачыцца свой разьлік — што ўлады не зарэгіструюць тры чвэрці кандыдатаў ад апазыцыі і да байкоту далучацца ўсе астатнія, хоцькі-няхоцькі.

# Караля

## зьмянялі на даму



Чарговы зьезд БСДГ прайшоў хутка — усяго за пяць гадзінаў. Станіслаў Шушкевіч быў безальтэрнатыўна пераабраны на старшыню. Сярод яго намесьнікаў — Валеры Арцішэўскі, Анатоль Астапенка, Мечыслаў Грыб, Аляксей Кароль і Ганна Кіявіцкая. Цікава, што Кароль, стаўшы намесьнікам старшыні Цэнтральнай Рады, ня быў абраны ў самую Раду. Не патрапіў у яе і «каралёвец» Павал Знавец, які займаўся арганізацыяй зьезду і быў адказны перад мясцовымі ўладамі за парадак на мерапрыемстве. Затое ў кіраўнічы орган была абраная пісьменьніца Вольга Іпатава. Колькасьць сацыял-дэмакратаў за апошні год вырасла на 900 чалавек, да 2700. Дзьве трэці новых сяброў — былыя члены «Народнай грамады».

# БНФ

## у сельсавеце



У Менскім раёне прайшлі давыбары дэпутатаў у сельскія саветы. Дэпутатам Юзуфоўскага сельсавету — рэдкі выпадак — стала сяброўка Партыі БНФ пэнсіянэрка Марыя Гацура. Сваю перадвыбарную кампанію спадарыня будавала на праблеме газіфікацыі вёскі.

# Янкі за Віслай




ЗША і Польшча абмяркоўваюць плян перанясеньня часткі вайсковых базаў зь Нямеччыны на ўсход. Ніводную з базаў не плянуецца размяшчаць на ўсход ад Віслы, бліжэй за 250 км ад беларускай мяжы. Расея гатовая ў адказ перанакіраваць частку сваіх ядравых ракетаў далёкага радыюсу дзеяньня на цэлі ў Польшчы. Таксама тактычная атамная зброя можа быць ізноў разьмешчаная ў Калінінградзе. Зрэшты, натаўскія крыніцы маркуюць, што яна там ужо прысутнічае з 1999-га, году пашырэньня Альянсу.

Расейцаў асабліва раздражняе разьмяшчэньне аэрадрому ў Повідзы. Цяпер амэрыканскі бамбавік можа даляцець ад польскай мяжы да Смаленску за 8 хвілінаў, а для прыняцьця рашэньня аб удары ў адказ ці вылеце зьнішчальнікаў расейцам трэба 15 хвілінаў.

Беларускія ўлады крытыкуюць магчымае разьмяшчэньне амэрыканскіх войскаў. Аднак пра разьмяшчэньне расейскае атамнае зброі ці дадатковых вайсковых базаў у Беларусі гаворка пакуль не ішла.

**Алег Тачоны**

# Чорныя дзіркі Бялынічаў

**Паданьне аб заснаваньні Бялынічаў сканчаецца заклікам-перасьцярогаю: пакуль бялынічане не адновяць кармэліцкага сабору, мястэчка і месьцічаў будуць перасьледаваць няшчасьці.**



Літаграфія Напалеона Орды з выявай бялыніцкага касьцёлу. Такім быў адзін з найбольш велічных касьцёлаў краіны.

Сама легенда ўзьнікла яшчэ за сівым пракаветным часам. А вось містычны фінал да яе быў дапасаваны пры канцы 30-х гадоў мінулага стагодзьдзя. Тады, згодна з загадам райкаму, велічны кармэліцкі касьцёл, «перахрышчаны» ў 1876 г. у праваслаўную царкву, пачалі перабудоўваць-прыстасоўваць пад народны дом. Ваяўнічыя бязбожнікі, ачмурэлыя ад нездаровага запалу руйнаваньня, на перасьцярогу не зьвярнулі ўвагу. І дарэмна.

Бялыніччыну найчасьцей абыходзяць хмары. Але калі каторая затрымаецца, дык засланіць сонца на колькі тыдняў і заліе ўсё. Ці вымакне збажына з травою ды бульбачкаю, ці выгарыць на сонцы. Высокага ўраджаю тут ніколі не было. Адсюль — галотныя калгасы ды саўгасы, бедныя вяскоўцы.

13 гадоў будуецца ў мястэчку Дом культуры. Паўстаў ён акурат на месцы ранейшага РДК, пабудаванага ў 1965 г. і чамусьці разбуранага ў 1990-м.

Улетку 2000 г. маланка спапяліла будынак раённага цэнтру культуры. Згарэлі канцэртныя касьцюмы, калекцыя народных строяў, безьліч музычных інструмэнтаў, фанатэка з запісамі мясцовага фальклёру.

Падобныя пералічэньні можна доўжыць. Але рэчаіснасьць не дапамагла перайначыць адносінаў месьцічаў да мясцовых гістарычных помнікаў, уласнай культурнай спадчыны. Многія бялынічане зь нейкім дзіцячым захапленьнем згадваюць жнівень 1967 г., калі брыгада спэцыялістаў зь Ленінграду падарвала двухсотгадовыя сьцены былога сабору (былога нардому, былой сярэдняй школы, былога раённага ДК, былога кінатэатру...). Засталася адна памяць — літаграфія Напалеона Орды з выявай касьцёлу.

На Бялыніччыне татальнаму вынішчэньню падверглася ўсё, што хоць неяк аддалена нагадвала пра старадаўнасьць мястэчка, вядомага ад 1577 г. На сёньня ў райцэнтры засталіся толькі дзьве старыя пабудовы, і тыя другой паловы XIX ст. — бровар з стайняй і былы банкаўскі будынак. Астатняеператворана ў крушню і закапана ў зямлю.

Да 11-й гадзіны дня 30 сьнежня 2003 г. быў у Бялынічах трэці помнік старасьвеччыны — фасадная сьцяна комплексу старых пабудоў у гістарычным цэнтры. Ад самых пабудоў нічога не засталося: іх зьнішчылі. Камуністычныя ўлады марылі зрабіць Бялынічы «чыстым, сьветлым, утульным сучасным пасёлкам». Для гэтага пазносілі пабудовы, а на іх месцы нічога ўзьвесьці не ўдалося. Утварылася «дзірка» на цэнтральнай вуліцы, якую прыхоўвала тая сьцяна.

Магчыма, яна была ўзьведзена яшчэ ў 60-я XVIII ст. у комплексе гаспадарчых будынкаў кармэліцкага кляштару і касьцёлу. Апошні быў пабудаваны ў 1760 г. А налета 20 кастрычніка адбылася найвялікшая ў яго гісторыі падзея — урачыстае ўскладаньне залатых карон на цудадзейны абраз Маці Божай Бялыніцкай. А мо сьцяну збудавалі ў другой палове XIX ст., і злучала яна навюткі будынак банку з суседнімі адміністрацыйнымі пабудовамі. Утвараўся архітэктурны комплекс, які надаваў мястэчку пэўны каларыт.

Мяне заўжды насьцярожвае, калі ў лексыконе кіраўнікоў розных узроўняў зьяўляецца слова «адраджэньне», калі яны пачынаюць ужываць тэрмін «добраўпарадкаваньне». Дабром гэта ня скончыцца. Як заўсёды, наламаюць дроў.

Фасадная сьцяна некалькі гадоў «мазоліла» вочы кіраўнікам раёну. «Пры канцы траўня 2000 г. тагачасны кіраўнік райвыканкаму Генадзь Шпакоўскі распарадзіўся разбурыць фасадную сьцяну, — згадвае настаўнік Васіль Цыркуноў, сябра Бялыніцкага краязнаўчага таварыства. — Мясцовыя краязнаўцы напісалі заяву ў пракуратуру, уступілі ў перамовы са старшынём райвыканкаму. Экскаватар з трактарамі зьехалі. Сьцяна была ўратавана. На два гады».

Два месяцы таму ў Бялынічы прыехаў працаваць нядаўні старшыня калгасу з Горацкага раёну Аляксандар Ільянаў. Пакуль ён толькі выконвае абавязкі старшыні райвыканкаму. Але ўжо пачаў «перакройваць» Бялынічы пасвойму. Пад прыкрыцьцём «добраўпарадкаваньня» павынішчаныя альбо скалечаныя абрэзкай (у сьнежні!) дрэвы на цэнтральных вуліцах. Не параіўшыся нават з намесьнікамі, Ільянаў загадаў будаўнікам мясцовай МПМК-241 разбурыць фасадную сьцяну. Што тыя і зрабілі. Управіліся за тры гадзіны. Друз вывезлі на трактарах і закапалі ў зямлю непадалёк ад вытворчай базы МПМК.

«Мяне насьцярожвае імкненьне сп.Ільянава дзейнічаць, беручы пад увагу толькі ўласнае меркаваньне, — гаворыць дэпутат Бялыніцкага райсавету Валер Вусік. — Падначаленыя баяцца яму запярэчыць, а сёй-той зь іх, каб толькі дагадзіць, гатовы і лоб свой разьбіць. Гэта ж толькі дадумацца: павысякалі дрэвы, у тым ліку і яблынькі, на тэрыторыі дзіцячых садочкаў №5, №7... А выхавальніцы вымушаны будуць цьвердзіць малым, што тыя абавязаны зь любоўю ставіцца да прыроды, аберагаць і шанаваць кожнае дрэўца, кожную кветачку. Спляжаны, часткова ператвораны ў паўтараметровыя слупы здаровыя дрэвы ў цэнтральным сквэрыку, на месцы колішняй сядзібы ўладальніка Бялынічаў Ігнацыя Агінскага... Што пакідаем нашчадкам?



У Бялынічах экскаватары разбураюць апошні гістарычны аб’ект. 2004 год.

Пачалася хваля даніштэньня тых гістарычных пазнакаў старадаўнасьці мястэчка, якія па шчасьлівай выпадковасьці ацалелі. Фасадную сьцяну, відаць, заменяць «сучаснай» агароджай...»

Вось-вось у Бялынічах пройдзе ўрачыстае адкрыцьцё пабудаванага-такі за 13 гадоў раённага Дому культуры. Але з кожным днём бялынічан ахоплівае трывога. Ужо ад добрага дзясятка месьцічаў чую, што адной набожнай жанчыне кожную ноч пачаў сьніцца страшэнны сон: новы РДК абрынуўся на людзей, якія сабраліся ў ім…

**Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы**

## Задушана адзіная незалежная газэта Гомельшчыны

**З новага году ў Сьветлагорску перастала існаваць недзяржаўная газэта «Регион-Вести».** Паводле словаў рэдактара Мікалая Паседзькі, друкаваньне газэты ў сьветлагорскай друкарні забараніў асабіста старшыня райвыканкаму Б.Пірштук, сказаўшы: «Народу няма неабходнасьці чытаць белібярду, якую вы пішаце ў сваёй газэце». Пад «белібярдой» кіраўнік вэртыкалі, відаць, меў на ўвазе вострыя пытаньні, якія газэта ўздымала: неразьбярыха з налічэньнем платы за камунальныя паслугі, перабоі з водазабесьпячэньнем, шыкоўны банкет для кіраўніцтва раёну на дзень гораду невядома за чый кошт і інш.

Улетку газэце адмовілі ўсе друкарні Гомельшчыны, газэта друкавалася ў Менску. Калі гэта стала задорага, выхад газэты быў спынены. А для сьветлагорцаў, якія выпісалі «Регион-Вести» на першы квартал 2004 г., рэдакцыі «літасьціва» дазволілі друкаваць праграмы мясцовага тэлебачаньня.

Сьветлагорская друкарня ня мае замоваў, работнікі фактычна без працы. Друкаваньне «Регион-Вестей» прыносіла б друкарні мільён рублёў у месяц. Раённыя кіраўнікі паабяцалі кампэнсаваць гэтую суму з раённага бюджэту. «Регион-Вести» былі адзінай незалежнай газэтай у Гомельскай вобласьці.

**Вадзім Болбас, Сьветлагорск**

## Сьцеражыцеся, хуліганы

**У Воршы створаны гарадзкі штаб дабраахвотных дружынаў па ахове правапарадку.** Народныя дружыньнікі, якія ў часы «разьвітага сацыялізму» былі аб’ектамі кпінаў, ізноў вяртаюцца ў нашае жыцьцё. У Воршы за 2003 г. вулічная злачыннасьць вырасла на 40%. Горад трымае неафіцыйнае званьне «сіняй» сталіцы краіны. Але ці будзе карысьць ад народных дружыньнікаў, калі правапарушальнікаў ня ў стане ўтаймаваць ні мясцовая міліцыя, ні байцы раскватараванага тут Віцебскага асобнага батальёну ўнутраных войскаў?

## Рэкляма — рухавік ідэалёгіі

**Аршанская рэклямная газэта «Телеком-экспресс» набыла за апошнія гады трывалую папулярнасьць у месьцічаў.** Раней яе неахвотна набывалі праз шматлікія рэклямныя аб’явы «куплю» ды «прадам». Цяпер, з павелічэньнем аб’ёму газэты, некалькі яе старонак прысьвячаюцца грамадзкаму і культурнаму жыцьцю Воршы. Асобную старонку пачалі адводзіць і пад паведамленьні БелТА пра шматбаковую дзейнасьць прэзыдэнта. І паспрабуй адмовіцца друкаваць! У ідэалягічнай працы ў нас задзейнічаны цяпер, відаць, і прыватныя газэты. Бо на вэртыкальную «Аршанскую газэту», якая мае сёлета ці не найменшы наклад за 85 гадоў жыцьця, надзеі марныя. Дый чытачы яе — збольшага пэнсіянэры ды вяскоўцы. А «Телеком-экспресс» мае наклад у тры разы большы, і чытаюць яго гараджане, маладыя ды сацыяльна актыўныя людзі.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Мытны рэкорд

**2003 год стаў рэкордным для Магілёўскай мытні.** 5 млрд 104 млн — такая цана канфіскаванага тавару. У параўнаньні з 2002 г. яна павялічылася ў пяць разоў. Сярод канфіскаваных тавараў — прадукты, цыгарэты, гарэлка, шыны, бытавая тэхніка, лом каляровых мэталаў, аўтамабілі і нават акустычная сыстэма для кінатэатру.

**Алеся Чыж, Магілёў**

## З старшыняў у фэрмэры

**Рашэньнем райвыканкаму 653 гектары сельгасугодзьдзяў расфармаванага саўгасу «Эсьмоны» перададзеныя ў арэнду былому дырэктару гаспадаркі, які цяпер стаў фэрмэрам.** Гэта будзе найбуйнейшая ў раёне фэрмэрская гаспадарка.

## Прага ведаў

**Невядомыя ўначы праз акно «наведалі» Сьвяцілавіцкую вясковую бібліятэку.** «Кнігалюбы» вынесьлі 52 тамы дзіцячай літаратуры.

**Б.Л-ч, Бялынічы**

# Мы — другія ў Эўропе!

Супэрфінал Кантынэнтальнага кубку па хакеі даў працаваць гомельскаму лядоваму палацу. Чатыры дні напружанай барацьбы скончыліся перамогай падарванага шматлікімі траўмамі братыслаўскага «Словану». Наш чэмпіён, «Гомель», узяў ганаровае другое месца, заваяваўшы сэрцы ня толькі беларускіх фанаў, але і прыхільнікаў гульні ва ўсёй Эўропе. Найбольш уразіла гледачоў перамога нашых хакеістаў над адным з самых моцных клюбаў Заходняй Эўропы — швайцарскім «Люгана».

Посьпех гамельчукоў многія сьпісваюць на «лёгкую» папярэднюю падгрупу і асаблівасьці формулы правядзеньня супэрфіналу, але назваць яго выпадковым не наважыцца ніхто. Паводле паказчыку + / – (розьніца закінутых шайбаў у сваю і чужую брамку падчас знаходжаньня гульца на пляцоўцы) першае месца на турніры мае абаронца «Гомелю» Павал Мікульчык, а яшчэ чатыры гульцы гомельскай каманды (Аляксандар Аляксееў, Яўген Есаулаў, Яўген Крывамаз і Ўладзімер Пераверзеў) займаюць месцы з трэцяга па шостае. А вось па колькасьці штрафных хвілінаў гаспадары турніру знаходзяцца на другіх ролях. Сапраўдным лідэрам «Гомелю» паказаў сябе Віталь Валуй, які закінуў чатыры шайбы.

Большасьці гульцоў «Гомелю» па 25—28 гадоў. Гэта век, у якім хакеісты выходзяць на найвышэйшы ўзровень за кар'еру. Таму пэрспэктывы «Гомелю» ў бліжэйшыя гады 3—4 мусяць быць неблагія. Калі не перакупяць нашых гульцоў. Бо чаго вартыя ўсе лядовыя палацы, калі зноў ня стане моцных камандаў.

**Зьміцер Казлоўскі**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Каманда «Гомель» пасьля парамогі над «Люгана»**

## З УСІХ СТАРОН

### Беларусь пасьля Кітаю

**Згодна з паведамленьнем швэдзкага Чырвонага Крыжа за 2003 г., 561 беспрытульнае дзіця з замежных краінаў давандравала да Швэцыі.** Усе яны зарэгістраваныя як уцекачы — шукальнікі прытулку. Ураджэнцы Беларусі па ліку займаюць сярод іх «ганаровае» пятае месца ўсьлед за Самалі, Аўганістанам, Іракам і Кітаем. 2/3 дзетак — хлопчыкі, 1/3 — маладзейшыя за 16 гадоў.

**АК, Стакгольм**

### Балівія патрабуе ад Чылі

**Балівія ў аўторак запатрабавала ад суседняй Чылі даць ёй выхад да мора.** Балівія выхаду да мора ня мае і праз гэта ня можа экспартаваць свае прыродныя багацьці, найперш газ. У той жа час, яна лічыць, што ўзьбярэжжа Ціхага акіяну і пустыня Атакама, захопленыя Чылі ў часе вайны 1879 г., павінны быць вернуты Балівіі. Назіральнікі баяцца новай вайны.

### Беларускія індзейцы ў Расеі

**У Сьвярдлоўскай вобласьці ў небясьпецы апынулася пасяленьне беларусаў-самаходаў.** Некалькі гадоў таму на рацэ Таборы, дзе жывуць беларусы, «Газпром» праклаў трубаправод. У выніку пачаўся мор рыбы. Гэта парушыла экалягічны баланс у раёне і паставіла пад пагрозу самі паселішчы беларусаў.

Беларусы зьявіліся ў Сьвярдлоўскім краі ў часы Сталыпіна. Ішлі яны пешшу, зрэдку на конях, таму іх там дагэтуль называюць «самаходамі».

Таборынскі раён — адзін з самых закінутых і маланаселеных на Сьвярдлоўшчыне. Прадпрыемстваў няма, таму беларусы захавалі традыцыйны ўклад жыцьця. Расейскае інфармацыйнае агенцтва «Інформ-Экалёгія» з захапленьнем паведамляе, што паляўнічыя маюць у сваім распараджэньні да 150 кв.км, ведаюць усе сьцежкі і звычкі зьвяроў. Запасы ласіцыны вымяраюцца тонамі і захоўваюцца ў вялікіх клецях, а журавіны замарожваюць мяхамі. Гаспадыні выкарыстоўваюць у прыгатаваньні ежы льняны і канапляны алей, а сланечнікавы ў іх непапулярны. «Беларускім самаходам уласьціва адушаўленьне, наданьне рысаў чалавечага характару жывёлам і расьлінам — настолькі сур'ёзна яны ставяцца да сьвету прыроды», — гаворыцца ў паведамленьні.

**ВДз; АШ**

## ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

# Гігантаў сабраў «Райфайзэн»

**Незвычайная сустрэча адбылася 12 студзеня ў Вене.** У «Райфайзэн Цэнтральбанку» прайшоў сэмінар для кіраўнікоў шэрагу буйных прадпрыемстваў і арганізацыяў Беларусі, зладжаны з дапамогай «Прыёрбанку». Удзел бралі кіраўнікі «Белнафтахіму», Беларускай чыгункі, Беларускага мэталюргічнага заводу, «Беларуськалію», магілёўскага «Хімвалакна», МАЗу, «Азоту», полацкага «Шкловалакна», Мазырскага нафтаперапрацоўчага заводу, гарадзенскага «Азоту», а таксама пасол Беларусі ў Аўстрыі Віктар Гайсёнак. Прадстаўнікі «Райфайзэну» распавядалі пра сваю дзейнасьць у 2003-м, а таксама крэдытную і кансультацыйную падтрымку прадпрыемствам Паўднёва-Ўсходняй Эўропы. Былі абмеркаваныя актуальныя праблемы крэдытаваньня рэальнага сэктару эканомікі Беларусі.

У той жа дзень адбыўся неафіцыйны візыт прэм'ера Сідорскага ў Аўстрыю. Хоць напярэдадні паведамлялася, што прэм'ер паедзе ў Маскву, перамаўляцца з расейскім калегам Касьяновым пра газавыя пастаўкі. Такая перамена плянаў магла быць вынікам пятнічнага візыту ў «Газпром» кіраўніцтва «Белтрансгазу». Паводле некаторых зьвестак, гендырэктар Пётар Пётух усе выходныя прабыў у Маскве, а яго намесьнік Дзьмітры Анюк у суботу вярнуўся й ладзіў тэрміновыя кансультацыі ў Саўміне. У Вене Сідорскі ўзяў удзел у паседжаньні назіральнай рады «Прыёрбанку», які цяпер належыць аўстрыйскай групе «Райфайзэн». Прэм'ер дагэтуль узначальвае назіральную раду «Прыёрбанку», прыбытак якога за 2003 г. склаў 40 млрд руб. Дзякуючы інвэстыцыям аўстрыйскага «Райфайзэнбанку», якому належыць 61,3% акцыяў «Прыёрбанку», уласны капітал апошняга вырас у 3,4 разу і склаў 87 млн даляраў. Актывы павялічыліся да 520 млн даляраў, крэдытныя магчымасьці — да 611 млрд руб. З дапамогай банку ў Беларусь былі прыцягнутыя 220 млн даляраў інвэстыцыяў. Уплывовы часопіс «The Banker» назваў «Прыёрбанк» банкам году ў Беларусі.

### Каньяк і шампанскае забароняць

**Завод «Крышталь», на думку Нацыянальнага цэнтру інтэлектуальнай уласнасьці, ня мае права рабіць і прадаваць каньяк, а Менскі завод ігрыстых вінаў — «Савецкае шампанскае».** Бо «Каньяк» і «Шампань» — месца паходжаньня тавараў, і называць гэтак тавары, зробленыя ў іншым месцы, забаронена.

### Мінімалка вырасла

**З 1 студзеня месячны мінімальны заробак вырас да 83 тыс. руб., а гадзінны — да 490 руб.** Цяпер мінімалка складае ўсяго 76% ад бюджэту месячнага пражытковага мінімуму.

### МАЗ пераносіць вытворчасьць

**МАЗ вымушаны пераносіць вытворчасьць у Прыбалтыку, каб захаваць эўрапейскі рынак збыту.** У краінах, што далучаюцца да ЭЗ, уводзяцца 22-працэнтныя мытныя падаткі на беларускую прадукцыю. А МАЗ трымаўся на рынках дзякуючы штучна заніжанай цане машынаў. МАЗы ж, сабраныя ў Літве і Латвіі, абкладацца падаткам ня будуць. У Літве плянуюць штогод зьбіраць 750, а ў Латвіі — 100 МАЗаў.

### Урад пагадзіўся на нявыгадныя мыты

**Урад уніфікаваў экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты з расейскімі мытамі.** Стаўка пошліны на нафту, якую вывозяць з тэрыторыі Беларусі ў краіны ЭўрАзЭС, вырасла з 26,8 да 31,2 даляра, стаўкі па нафтапрадуктах — з 24,1 да 28,1 даляра. Мытныя стаўкі па больш чым 400 таварных пазыцыях уніфікуюцца з расейскімі. У большасьці памер зьніжаецца або ўсталёўваецца нулявая стаўка.

### Вырасьлі абароты прадпрымальнікаў

**На 1 сьнежня 2003 г. у Беларусі на ўліку стаяла 191,3 тыс. індывідуальных прадпрымальнікаў.** Гэта на 1,8 тыс. болей, чем на пачатку 2003 г. За аналягічны пэрыяд 2002 г. іх колькасьць павялічылася на 12,5 тыс. Агульная сума сплачаных імі падаткаў павялічылася амаль у два разы і склала 298,3 млрд рублёў.

### «Сармату» не аддалі «Абалонь»

**Антыманапольны камітэт Украіны забараніў ЗАТ «Сармат», аднаму зь лідэраў украінскае піўное галіны, набыць больш за 50% акцыяў ЗАТ «Абалонь».** Калі б кампаніі аб'ядналіся, яны ахапілі б 37,2% агульнадзяржаўнага рынку піва і стварылі б манаполію.

### Made in EU

**Хутка з тавараў, якія вырабляюцца ў краінах Эўразьвязу, можа зьнікнуць надпіс «made in Poland» ці «made in Germany».** Замест іх зьявіцца «made in EU». Паводле «Financial Times», гэта адзін з сцэнароў новага маркаваньня тавараў, якія разглядае Эўракамісія. Супраць выступаюць Нямеччына і нацыяналісты розных краінаў. За — выбарцы малавядомых у сьвеце дзяржаваў.

### У абыход Расеі

**14 студзеня ўрад Украіны ратыфікаваў дамову з Польшчай аб падаўжэньні нафтаправоду Адэса—Броды да Плоцку.** Насуперак пажаданьням Расеі, па ім на Захад пойдзе каспійская нафта.

### «Рацыю» пазбаўляюць ліцэнзіі

**У Польшчы пачаўся працэс пазбаўленьня ліцэнзіі адзінага ў гэтай краіне беларускамоўнага радыё «Рацыя»,** якое перадавала зь Беластоку ў тым ліку і на тэрыторыю Беларусі. Гэта адбываецца таму, што радыё «Рацыя» не перадае ўжо больш за 18 месяцаў. Няма грошай.

**МБ**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

9 студзеня ў Барысаве актывіст незарэгістраванай моладзевай арганізацыі «Зубр» **Алесь Моніч** атрымаў судовае папярэджаньне за ўдзел у акцыі «Мы помнім» на Міжнародны дзень правоў чалавека 10 сьнежня. Сьведка-міліцыянт, даючы паказаньні, казаў, што акцыя прысьвячалася Дню Незалежнасьці. Уначы з 8 на 9 студзеня невядомыя зламалі ў Курапатах памятны дар амэрыканскага народу — г.зв. **«лаву Клінтана»**. З 1997 г. гэта чацьвертая спроба зьнішчэньня памятнага знаку. Незалежная прафсаюзная газета **«Салідарнасць»** вымушаная выходзіць у Смаленску: беларускія друкарні ёй адмовілі. Прадпрыемствы «Белпошта» і «Белсаюздрук» у аднабаковым парадку скасавалі дамову зь **«Белорусской деловой газетой»** аб распаўсюдзе. У ноч на 11 студзеня карэспандэнтцы «БДГ» па Гомельскай вобласьці **Ірыне Макавецкай** паступіла ананімная тэлефонная пагроза. Ёй пагражалі сьмерцю, патрабавалі спыніць пісаць. Кіраўнік Сусьветнай арганізацыі беларускіх габрэяў **Якаў Гутман** быў затрыманы міліцыянтамі 14 сьнежня за несанкцыяваны пікет ля будынку Адміністрацыі прэзыдэнта. Гутман ледзь пасьпеў разгарнуць плякат з заклікам «спыніць разбурэньне ў Беларусі габрэйскіх сьвятыняў, габрэйскіх могілак, а таксама помнікаў ахвярам Галакосту».

**АШ**

## КАЛЯНДАРЫК

# Тэнтэн



Папулярны ва ўсім сьвеце коміксавы пэрсанаж, адсьвяткаваў 75-годзьдзе. Ён перажыў свайго стваральніка, мастака Эжэ, якога ня стала ў 1983-м. У самай першай сэрыі апавядалася пра прыгоды бульбаносага чубатага журналіста і яго сабакі ў СССР. Пасьля Тэнтэн вандраваў на Полюс, у Афрыку, на Блізкі Ўсход. У адрозьненьне ад Мікі Маўса або Мякіша з Сухаром, ён не цураўся палітыкі. Невыпадкова дэ Голь казаў, што Тэнтэн — яго адзіны канкурэнт на міжнародным полі. Да юбілею радзіма-Бэльгія адбіла 50000 манэтаў з выявай Тэнтэна. Іх намінал — 10 эўра, але прадавацца яны будуць па 31 эўра як нумізматычная рэдкасьць.

## 19 студзеня панядзелак

**● БТ**
7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.50 Слова мітрапаліта Філарэта на Вадохрышча.
9.05 «У цэнтры ўвагі».
10.05 «36,6».
10.35 Падарожжа дылетанта. «Вёска Астрашыцкі гарадок. Астрашыцкі зьвярынец».
11.05 «Шпілька». Тэлечасопіс для жанчын.
11.35 «Сузор'е надзей». II Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
12.10 Спэцыяльны рэпартаж.
12.25 Камэдыя «Па запалкі».
14.05 Тэлеклюб «Ваша лята».
14.45 «Мая краіна».
15.15 Сэрыял «Прыгадаць усё».
16.05 «Кліп-абойма». Хіт-парад.
17.05 «Між іншым...».
18.05 «Самазванцы». Сэрыял.
18.55 Гандбол. Адборачны матч чэмпіянату сьвету. Беларусь — Аўстрыя. Жывая трансьляцыя.
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 Маст. фільм «Раба каханьня».
23.30 «Час спорту».

**● ЛАД**
6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 Правінцыйныя гісторыі.
8.40 Сэрыял «Разьвязка пецярбурскіх тайнаў».
9.45 Наша спадчына. «Белавеская пушча».
9.55 Тэлебаромэтар.
10.15, 18.05 «Паміж намі, жанчынамі».
10.35 Маст. фільм «І сьмех, і гора».
11.15, 13.20 «Звычайныя незвычайныя дзень».
11.45 Маст. фільм «Італьянская каханка».
13.50 «Грыбок-церамок». Мультфільм.
14.10 «Шэрая шыйка», «Урокі цётухны Савы. Азбука-малышка». Мультфільмы.
14.35 Сэрыял «Нашы самыя цудоўныя канікулы».
15.00 «Не зявай!».
15.10 «Бум».
15.35 Драма «...Аз вазам».
18.25 «Мы — выратавальнікі». Музычны фільм.
18.50 Маст. фільм «Сяброў не выбіраюць».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».
21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
22.05 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Дзёньнік туру.

**● СТВ**
6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30 «168 гадзін».
8.20 «Менск і менчукі».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: маст. фільм «Вялікае абрабаваньне банку».
10.20 «Асабістыя інтэрас».
11.00 «Дзікая плянэта». «Сяродзікіх зьвяроў». Дак. фільм.
11.30 «Анфас».
11.45 «Тэлеафіша».
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам». «Дарога да храму». Дак. фільм.
13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
13.50, 18.30 «Жаданая». Тэлесэрыял.
14.50 Дак. фільм «Абстрактныя разважаньні ў фарбах».
15.15 «Маска». Мультсэрыял.
16.00 «Русалка», «Казка пра скварнасьць». Мультфільмы.
16.20 «Турпаход».
16.50 Дак. фільмы «Сафія Полацкая», «Жыровічы. Тут...».
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка». Сэрыял.
18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.15 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
20.00 «СТВ-спорт».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 «Кадравае пытаньне».
20.55 Кіно: камэдыя «Выхаваньне Арызоны».
23.15 «Сталічны футбол зь Сяргеем Бароўскім».
23.40 «Навіны СНД».
23.55 Кіно: маст. фільм «Канвой».
1.45 «Вялікая музыка».

**● АНТ**
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.40 Нашы навіны.
8.05 Канцэрт «Мэлёды і рытмы замежнай эстрады па-расейску».
9.05 Контуры.
9.50, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
10.35 Сьледзтва вядзе Калабкоў.
15.10 Горад жанчын.
15.45 Сэрыял «Бераг мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.00 Ток-шоў «Выбар».
21.40 Шматсэрыйны фільм «Наступны» («Next-3»).
22.50 Камэдыя «Выбух зь мінулага».

**● РТР**
7.45 Камэдыя «Круты Джо».
9.40 «У Гарадку».
9.45, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
10.45, 19.55 Сэрыял «Расейскія амазонкі-2».
11.50, 21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 Дэтэктыў «Марасейка, 12». «Бабіна лета».
17.00 Сэрыял «Назаўсёды Джулія».
17.55 Сэрыял «Тайны сьледзтва. Труна на дзьве асобы».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Весткі+.
22.20 «Праклён Тамэрлана».
23.30 Маст. фільм «Ніколі не размаўляй зь незнаёмцамі».

**● НТВ**
9.00 Сёньня раніцай.
9.25 «Надоечы» зь Леанідам Парфёнавым.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.30 Пратакол.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.35 Сэрыял «Мангуст».
19.50 Сэрыял «Таксістка».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 «Блякада Ленінграду».

**● Эўраспорт**
4.00, 14.00, 15.30, 19.00, 2.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
20.00, 23.15 Футбол. Эўрагалы.
21.00 Мультыспорт.
21.30 Баявыя адзінаборствы. Байцоўскі клюб.
0.15 Мультыспорт. Госьць тыдня.
0.30 Навіны «Эўраспорту».
0.45 Тэніс. Тэнісныя гісторыі.

## 20 студзеня аўторак

**● БТ**
7.00, 8.00, 9.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 16.45, 23.20 «Мая краіна».
15.15 «Час спорту».
15.40 «Маскі-шоў».
16.05 «5х5».
17.05 Сэрыял «Міс Марпл».
18.05 «Самазванцы». Сэрыял.
19.05 Камэдыя «Дуэты».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 Трылер «Доўгі ўік-энд».
23.35 «Любы капрыз».

**● ЛАД**
6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 «Ёсьць толькі міг...».
8.35 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Дзёньнік туру.
9.40 «Сьпявай, душа!». Калядныя сьвяты ў Магілёўскім раёне.
10.10, 18.30 «Паміж намі, жанчынамі».
10.30, 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.15, 12.55 «Звычайныя незвычайныя дзень».
11.50, 18.50 Сэрыял «Сяброў не выбіраюць».1-я сэрыя.
13.20 «Баранкін, будзь чалавекам!», «Сівы мядзьведзь». Мультфільмы.
14.10, 15.30 «Не зявай!».
14.50 «Сінявочка». Мультфільм.
15.05 Сэрыял «Нашы самыя цудоўныя канікулы».
15.40 «Бум».
16.05 Міні-опэра «Чырвоная Шапачка».
17.00 «Настальжы».
17.30 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».
22.05 Сэрыял «Разьвязка пецярбурскіх тайнаў».

**● СТВ**
6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50. 20.00 «СТВ-спорт».
8.15, 18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.30, 23.35 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: камэдыя «Выхаваньне Арызоны».
10.20 «Сталічны футбол зь Сяргеем Бароўскім».
10.45 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.00 «Дзікая плянэта». «Сяродзікіх зьвяроў». Дак. фільм.
11.30 «Пакуль гарыць сьвечка».
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам». «Забароненае каралеўства». Дак. фільм.
13.50, 18.30 «Жаданая». Тэлесэрыял.
14.50 «Шайбу, шайбу!». Мультфільм.
15.15 «Маска». Мультсэрыял.
16.00 «Жыў-быў сабака», «Зялёная пілюля». Мультфільмы.
16.15 «Кадравае пытаньне».
16.50 «Шлях да здароўя». Дак. фільм.
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка». Сэрыял.
18.15 «Добры дзень, доктар!»
20.15 «Тэма дня».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 «Закон і крымінал».
20.55 Кіно: баявік «Дрэва «Джошуа».
23.05 «Гарачы лёд».
23.45 «Навіны СНД».
0.00 Кіно: маст. фільм «Грэх. Гісторыя жарсьці».

**● АНТ**
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.55 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Шматсэрыйны фільм «Наступны» («Next-3»).
10.45 Дыснэй-клюб. «Цімон і Пумба».
15.00 «Горад жанчын».
15.45 Сэрыял «Бераг мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Куміры».
18.40 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
21.00 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
21.55 Шматсэрыйны фільм «Наступны» («Next-3»).
23.05 «Ня толькі пра футбол».
23.25 Тайны стагодзьдзя. «Амэрыка пад ударам».
0.05 «На футболе».

**● РТР**
7.45, 19.55 Сэрыял «Расейскія амазонкі-2».
8.50 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
9.45, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
10.50 «Чаго хоча жанчына». Ток-шоў.
11.50, 21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 Дэтэктыў «Марасейка, 12». «Бабіна лета».
17.00 Сэрыял «Назаўсёды Джулія».
17.55 Сэрыял «Тайны сьледзтва. Труна на дзьве асобы».
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Весткі+.
22.20 «Юры Грыгаровіч. Пасьля «Вялікага».
23.30 Дэтэктыў «Тот, якога заказалі».

**● НТВ**
9.00 Сёньня раніцай.
9.25 «Дзікі сьвет». Ваўчыная палітыка.
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.30 Пратакол.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.35 Сэрыял «Мангуст».
19.50 Сэрыял «Таксістка». 6-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 «Блякада Ленінграду».

**● Эўраспорт**
4.00, 14.00, 15.30, 19.00, 1.00, 2.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
20.00 Скачкі з трампліну. Кубак сьвету.
21.00 Бокс. Міжнародныя спаборніцтвы.
0.00 Алімпійскія гульні. Мэта — Атэны.
0.30 Навіны «Эўраспорту».
0.45 Тэніс. Тэнісныя гісторыі.

## 21 студзеня серада

**● БТ**
7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.40, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.10 «Расейскія амазонкі». Сэрыял.
10.05, 17.05 Сэрыял «Міс Марпл».
11.05, 18.05 «Самазванцы». Сэрыял.
12.15 Камэдыя «Дуэты».
14.15 Тэлегульня «Аднакласьнікі».
15.15 Сэрыял «Прыгадаць усё».
16.05 «5х5».
20.40 «Краіна, якую люблю». Відэафільм.
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 Маст. фільм «Шчупальцы».
23.35 «Чэмпіёны».

**● ЛАД**
6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 Плошча мастацтваў.
8.35, 22.05 Сэрыял «Разьвязка пецярбурскіх тайнаў».
9.35 «Сад мары».
10.05, 18.30 «Паміж намі, жанчынамі».
10.25, 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.15, 12.55 «Звычайныя незвычайныя дзень».
11.45, 18.50 Сэрыял «Сяброў не выбіраюць».
13.25 «Тайна далёкага вострава», «Урокі цётухны Савы. Арытмэтыка-малышка». Мультфільмы.
14.10 Мультыклюб.
15.05 Сэрыял «Нашы самыя цудоўныя канікулы».
15.25 «Не зявай!».
15.35 «Бум».
16.05 «Запрашэньне. Срэбраны век расейскага мастацтва».
16.55 «Трыцца гадоў чаканьня». Дак. фільм.
17.20 «Росчырк часу».
17.35 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».

**● СТВ**
6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт»
8.05, 18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15, 20.15 «Менск і менчукі».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: маст. фільм «Дрэва Джошуа».
10.20, 20.40 «Аўтапанарама».
10.40 «Закон і крымінал».
11.00 «Дзікая плянэта». «Сяродзікіх зьвяроў». Дак. фільм.
11.30 «Гарачы лёд».
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам». «Забароненае каралеўства». Дак. фільм.
13.50, 18.30 «Жаданая». Тэлесэрыял.
14.50 «Воўка ў трыдзявятым царстве». Мультфільм.
15.15 «Маска». Мультсэрыял. Заключная сэрыя.
16.00 «Кракадзіл Гена». Мультфільм.
16.20 «Тэма дня».
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка». Сэрыял.
18.15 «Плянэта людзей».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: маст. фільм «Мая дзяўчынка».
23.15 «Навіны СНД».
23.30 «Праект «Адлюстраваньне». «Гісторыя аднаго захопу». Дак. фільм.
0.00 Маст. фільм «Лэсі вяртаецца».

**● АНТ**
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.55 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 21.55 Шматсэрыйны фільм «Наступны» («Next-3»).
10.45 «Ня толькі пра футбол».
11.05 Дыснэй-клюб. «Цуды на віражах».
14.55 «Горад жанчын».
15.45 Сэрыял «Бераг мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Шукальнікі». «Атлянтыда» на берагах Дняпра».
18.40 Сьмехапанарама.
20.00 Час.
21.00 «Слабае зьвяно».
23.05 Трылер «Ярды».

**● РТР**
7.45, 19.55 Сэрыял «Расейскія амазонкі-2».
8.50 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
9.45, 22.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
10.50 «Чаго хоча жанчына». Ток-шоў.
11.50, 21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 Дэтэктыў «Марасейка, 12». «Былы, паліцэйскі».
17.00 Сэрыял «Назаўсёды Джулія».
17.55 Сэрыял «Тайны сьледзтва. Труна на дзьве асобы».
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Весткі+.
22.20 «Бяз гальштука».
23.05 Маст. фільм «Барак».

**● НТВ**
9.00 Сёньня раніцай.
9.25 Кулінарны паядынак.
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.30 Пратакол.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.50 Сэрыял «Мангуст».
19.50 Сэрыял «Таксістка».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 «Маўзалей».

**● Эўраспорт**
4.00, 14.00, 16.45, 19.00, 1.00, 2.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
15.15, 20.00 Біятлён. Кубак сьвету.
21.15 Снукер. Адкрыты чэмпіянат Ўэльсу.
0.30 Алімпійскія гульні. Культурная праграма Алімпіяды.
0.45 Навіны «Эўраспорту».

## 22 студзеня чацьвер

**● БТ**
7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 14.45, 16.45, 23.30 «Мая краіна».
9.10 «Расейскія амазонкі». Сэрыял.
10.05, 17.05 Сэрыял «Міс Марпл».
11.05 «Самазванцы». Сэрыял.
12.20 Маст. фільм «Шчупальцы».
14.05 «Кропка».
15.15 Сэрыял «Прыгадаць усё».
16.05 «5х5».
18.05 «Самазванцы». Сэрыял.
19.05 Драма «Прыкаваны».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.50 Маст. фільм «Сямейныя таямніцы».
23.45 «Новая калекцыя» Алега Лукашэвіча.

**● ЛАД**
6.30 EURONEWS.
8.00, 14.00, 20.00 Навіны.
8.10 Плошча мастацтваў.
8.40, 2.05 Сэрыял «Разьвязка пецярбурскіх тайнаў».
9.35 «Здароўе».
10.05, 18.35 «Паміж намі, жанчынамі».
10.30, 21.15 Сэрыял «Грэшная Анхеліка».
11.15, 12.55 «Звычайныя незвычайныя дзень».
11.50, 18.55 Сэрыял «Сяброў не выбіраюць». Заключная сэрыя.
13.25 «Генэрал Таптыгін», «Нязнайка вучыцца». Мультфільмы.
14.10 Мультыклюб.
15.05 Сэрыял «Нашы самыя цудоўныя канікулы». Заключная сэрыя.
15.25 «Не зявай!».
15.35 «Бум».
16.00 «Казкі хрустальнага шарыка». Мультфільм.
16.10 «Жывая душа дрэва». Дак. фільм.
16.25 «У чаканьні».
17.00 «Аркестравая яма». Ток-шоў.
17.40 Сэрыял «Вяртаньне Шэрлака Холмза».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».

**● СТВ**
6.25, 15.40 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры ў космасе». Тэлесэрыял.
6.50 «Блізьняты лёсу». Мультсэрыял..
7.30, 13.30, 16.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.05, 18.00 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15 «Сьвецкая хроніка».
8.30, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: маст. фільм «Мая дзяўчынка».
10.15 «Лёсу свайго гаспадыня».
10.35, 20.40 «Фільм, фільм, фільм».
10.50 «Праект «Адлюстраваньне». «Гісторыя аднаго захопу». Дак. фільм.
11.20 «Дзікая плянэта». «Новыя запаведнікі». Дак. фільм.
11.45 «Партрэт у інтэр'еры.
12.00 «Час суду».
13.00 «Дыялёг з усім сьветам». «Забароненае каралеўства». Дак. фільм.
13.50, 18.30 «Жаданая». Тэлесэрыял.
14.50 «Растрапаны вецер». Мультфільм.
15.15 «Рыцары сьвету». Мультсэрыял.
16.00 «Чабурашка». Мультфільм.
16.20 «Запрашаем паскардзіцца...».
16.50 «Альтэрнатыўнае паліва».
17.00 «Агенцтва». Сэрыял.
17.30 «Вовачка». Сэрыял.
18.15 «Тэатральныя гісторыі».
20.15 «Тэма дня».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: баявік «Воін мары».
23.15 «Навіны СНД».
23.30 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
0.15 Кіно: трылер «Уцёкі».

**● АНТ**
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.50 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 21.55 Шматсэрыйны фільм «Наступны» («Next-3»).
10.45 «Ералаш».
11.05 Дыснэй-клюб. «Баз і яго каманда».
14.55 «Горад жанчын».
15.45 Сэрыял «Бераг мары».
16.30 «Угадай мэлёдыю».
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Тэорыя неймавернасьці». «Загадка часу».
18.40 Проста сьмех!
20.00 Час.
21.00 «Прафэсія — Ярмольнік». Фільм цыклу «Цікавае кіно».
23.00 «Чалавек і закон».
23.40 Маст. фільм «Сэрца дракона».

**● РТР**
7.45, 19.55 Сэрыял «Расейскія амазонкі-2».
8.50 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
9.45, 23.15 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30, 19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
10.50 «Чаго хоча жанчына». Ток-шоў.
11.50, 21.00 Сэрыял «Неадкладная дапамога».
16.10 Дэтэктыў «Марасейка, 12». «Былы, паліцэйскі».
17.00 Сэрыял «Назаўсёды Джулія».
17.55 Сэрыял «Тайны сьледзтва. Труна на дзьве асобы».
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Весткі+.
22.20 «Гістарычныя хронікі».
23.30 Драма «Птах».

**● НТВ**
9.00 Сёньня раніцай.
9.25 Кватэрнае пытаньне.
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.30 Пратакол.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.55 Сэрыял «Мангуст».
19.50 Сэрыял «Таксістка».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.45 «Да бар'еру!».

**● Эўраспорт**
4.00, 11.45, 14.00, 19.00, 1.00, 2.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
15.15 Біятлён. Кубак сьвету.
16.45 Скачкі з трампліну. Кубак сьвету.
18.00 Бабслей. Кубак сьвету.
20.00, 21.30 Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльсу.
21.00 Алімпійскія гульні. Мэта — Атэны.
0.15 Ралі. Чэмпіянат сьвету ў Манака.
0.45 Навіны «Эўраспорту».

# Ты — сын зямлі тваёй

**Зіма. Спакойны сьнежаньскі вечар. Людзі рыхтуюцца да Новага году. Трэба пасьпець разьлічыцца з пазыкамі, дарабіць пачатыя справы, каб у новым годзе распачаць жыцьцё нанава. Кожны чакае чагосьці новага, сьветлага, спадзяецца на лепшае.**

Час позьні. Стомлены і злосны, Ён вяртаецца дахаты. Яго даўно не задавальняе жыцьцё. Жыцьцё тут, у гэтай краіне, аб якой ніхто ня ведае, такой маленькай і нязначнай у сьвеце. Жыцьцё без справядлівасьці, без надзеі на лепшае. У Яго ўжо даўно зьявілася мара — жыць за мяжой, зарабляць многа грошай і атрымліваць асалоду ад жыцьця дзе-небудзь на беразе мора. Магчыма, таму менавіта цяпер — у час чаканьня пераменаў — Ён такі раздражнёны. Надышла пара ажыцьцявіць запаветную мару.

Ён ледзь пасьпявае на свой тралейбус. Ехаць далёка. На шчасьце, знайшлося свабоднае месца. Халодна, але ён гэтага не заўважае. Думкі пачынаюць блытацца, ён заплюшчвае вочы і адчувае, як паступова агортваюць яго цеплыня і спакой...

— Ну што, пара разьвітвацца? Няўжо нічога не трымае цябе тут? Ты ж сын гэтай зямлі, нашчадак беларусаў.

Зноў гэтая іранічная ўсьмешка, што зьяўляецца на тваім твары, калі чуеш узьнёсла-патрыятычныя словы. Вядома, «фальшывы патрыятызм» табе не ўласьцівы. І наагул ніякі не ўласьцівы. Упэўнены? Тут жа ўсё такое блізкае і знаёмае. Кожная дробязь, кожная дэталька прабуджае табе аднаму вядомыя адчуваньні, выклікае ўспаміны. Не, гэта ня проста звычка. Гэта праява твайго несьвядомага патрыятызму. А ці ня радуюць цябе перамогі беларусаў у спорце ці нават у гульнях КВК? І гэта праяўляецца твой неразьвіты патрыятызм. Ты нарадзіўся і жывеш тут, ходзіш па гэтай зямлі, дыхаеш гэтым паветрам. Гэта краіна твая, а ты — яе. Ты — беларус. Называеш беларусаў забітай, запрацаванай, маўклівай і пагарджанай нацыяй? Толькі памятай, што і ты — часьцінка гэтай нацыі, што кожная твая рыса — рыса нацыі. Але ж ты адчуваеш сябе сьмелым, упэўненым, ні ад кога не залежным. Тады чаго маўчыш? Чаму нічога ня робіш, каб менавіта гэтыя рысы сталі рысамі тваёй нацыі? А чаго не прыгадаў і іншыя асаблівасьці беларусаў: іх гасьціннасьць, пачуцьце гумару, дабрыню і чуласьць да чужой бяды. Ты не такі? А колькі беларусаў сярод знакамітых пісьменьнікаў, вучоных, мастакоў, сьпевакоў, спартсмэнаў ня толькі ў мінулым, але і цяпер! Ты атрымаў ад продкаў багатую спадчыну, каштоўны скарб, пазнаваць які можна ўсё жыцьцё. Вось толькі што зробіш ты, каб павялічыць гэты скарб? Ці хаця б захаваць яго такім жа поўным, каб нашчадкі, больш сьвядомыя за цябе, маглі атрымаць асалоду ад набыткаў мінуўшчыны? Трэба шукаць *сапраўды* сваё месца ў гэтым жыцьці, у гэтай краіне. І гэта намнога прасьцей і прыемней, чым быць заўсёды непатрэбным, непрызнаным на чужыне. Намнога прыемней...

Ён ледзь на праспаў свайго прыпынку. Ішоў лёгкі сьняжок. Ён упершыню заўважыў, як прыгожа навокал. Заміраае душа ад прадчуваньня нечага новага. А можа, вяртаньня да старога і правільнага?

**Аксана Зяньковіч, Івянец**

**«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.** З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваньня допісаў. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць допісы поштай, электроннай поштай ці факсам.

Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.



ДЗЯНІС РАМАНЮК

# Чатыры дні ў Вільні

**Пані Вільня... Колькі разоў даводзілася чуць, што недзе там, за 180 кілямэтраў ад Менску, знаходзіцца сапраўднае сэрца «краіны крывавых дажджоў».** Гэта сэрца даўно мае ўласны рытм і стук. Але нешта ў Вільні заварожвае менавіта нас, беларусаў, уражвае, натхняе і дадае моцы, не патрабуючы нічога ўзамен. Для сябе я назваў гэта — душа Вільні...

Новага году тут не адчуваеш, адчуваеш Каляды. Вось яна, славутая Вострая брама, наверсе красуе мілая сэрцу Пагоня. Ты ня проста трапляеш у Стары горад, а апынаешся ў зусім іншым вымярэньні. І, вяртаючыся ўвечары ў гатэль праз тую ж Вострую браму, не адчуваеш, што пакідаеш тое вымярэньне. Наадварот! Замест сярэднявечных брукаваных вулачак зь ліхтарыкамі ды старажытных цэркваў з касьцёламі ты атрымліваеш сучасны эўрапейскі горад, усё роўна родны і блізкі. І справа нават ня ў тым, што ў гіпэрмаркеце «Акропаліс» у скрыначцы для ахвяраваньняў побач зь літоўскімі манэтамі красуюць нашыя «зайчыкі». Іх накідалі туды хутчэй за ўсё навучэнцы Беларускага Ліцэю, якія ў гэты час недзе тут побач, праводзяць вакацыі... Шырацца межы твайго знаёмства з горадам, зь якім ты ўжо так зросься, што і не заўважаеш, як на чацьверты дзень трэба зьяжджаць, надыходзіць неабходнасьць вяртацца ў сваю рэчаіснасьць.

Той самы вакзал. Не пакідае адчуваньне, што ты нешта набыў. Нешта такое, чаму няма ні назвы, ні, тым больш, цаны. Гэта «нешта» застанецца ў самых нетрах тваёй душы назаўсёды. Чатыры гадзіны — і ты дома. А ў Менску — Новы год...

**Аляксандар Квіткевіч, Менск**

# Вандэя і Алесь Адамовіч

**Калі людзі губляюць энтузіязм, яны схільныя вінаваціць таго, хто яго абудзіў.** Так здарылася і з Алесем Адамовічам. На пачатку 80-х ён назваў Беларусь «Вандэяй перабудовы». Тады гэта спадабалася, бо ўсім абрыдла бэзсэсэраўскае кіраўніцтва (Сьлюнькоў, Дземянцей), якое бесперапынна хлусіла, сьцьвярджаючы, што ўсё ў нас «о'кей» — з мовай, з радыяцыяй, з правамі чалавека. Патрэбна было слова-сымбаль, якое б адразу назвала ўсё, што набалела. Яго знайшоў А.Адамовіч. І адразу сам стаў сымбалем супраціву. Такое становішча надзейна абараняе ад крытыкі, але толькі да таго часу, пакуль доўжыцца супраціў.

Як толькі скончылася перабудова, з А.Адамовіча пачалі пасьмейвацца: знайшоў як назваць, Вандэя — гэта ж рух заможных (а значыць, найлепшых) сялян супраць усялякіх рэвалюцыянэраў-перабудоўшчыкаў, ад якіх усё ліха на сьвеце.

Каб зразумець, чым ёсьць Вандэя, зьвернемся да раману В.Гюго «Дзевяноста трэці год». Француcкі клясык напэўна разьбіраўся ў Вандэі лепш за нас: яго маці паходзіла з гэтай францускай правінцыі, што паўстала супраць рэвалюцыі. Вось што гаворыць правадыр вандэйцаў маркіз Лянтэнак: «Правы чалавека! Правы народу! Якім толькі глупствам ня цешаць людзей... Слова «хімэра» мае падвойны сэнс — ім пазначаюць мару і ім жа пазначаюць пачвару». Можна цытаваць далей, але і гэтага дастаткова, каб зразумець: Вандэя — гэта адмаўленьне права чалавека на імкненьне да шчасьця. Калі нават думка аб тым, што можа быць лепш, чым ёсьць, абвяшчаецца злачынствам. Дзеля чаго? Вандэя скажа вам: дзеля захаваньня найлепшых традыцый мінулага, спакою ў грамадстве. А на самай справе — каб і надалей невялічкая група людзей магла рабіць усё, што захочацца. Так было ў Францыі ў часы рэстаўрацыі Бурбонаў, так было ў СССР пасьля 1968-га, так ёсьць цяпер у нас...

Усё сваё жыцьцё Адамовіч змагаўся з вандэяй. Пісаў ён аб Кузьму Чорным, пранікаў у сьвядомасьць катаў, вёў двубой з сталінскім пракурорам... Заўсёды гэта была барацьба з прыніжэньнем чалавека, з тым, без чаго ня можа быць вандэі.

Сёньняшняя вандэя — працяг той, зь якой змагаўся Адамовіч. Як і яе папярэдніца, яна хлусіць, сьмяецца з правоў чалавека. А вось другога Алеся Адамовіча няма. Таму можна казаць, што ўсё ў парадку з мовай, з радыяцыяй, што нікога ў нас ня б'юць, не разганяюць, акрамя асобных «адмарозкаў» і парушальнікаў грамадзкага парадку. Абы заступацца за гонар бацькі ўсіх народаў і не баяцца грамадзкай думкі, бо яна маўчыць.

**Вацлаў Шаблінскі, Менск**

# Ці ж я менш працаваў, чым палкоўнікі?

**Пасьля атрыманьня атэстату сталасьці я падзяліўся з сваім клясным кіраўніком сакрэтам, куды буду паступаць вучыцца далей, назваўшы вышэйшую школу МУС.** Ён, прыставіўшы ўказальны палец да скроні і пакруціўшы ім, дадаў: «Хай туды паступаюць (назваў некалькі хлопцаў-адна-клясьнікаў), а ты здольны ня толькі адно падпарадкоўвацца, але і разважаць, і стварась». Я паслухаў кляснага кіраўніка і паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут, праўда, ужо пасьля прахожданьня тэрміновай службы на працягу трох гадоў з гакам на армянска-турэцкай мяжы пад Гюмры (Ленінаканам). Працуючы, пабудаваў у вёсцы дом, хлеў, у якім трымаю сякую-такую жыўнасьць для папаўненьня харчовых запасаў, бо на пэнсію ў 120 тысячаў «зайцоў» існаваць праблематычна. А каб жыўнасьць жыла, тлусьцела і нагульвала вагу, даводзіцца апрацоўваць прысядзібны ўчастак зямлі памерам да 1 га. Болей не даюць, толькі праз арэнду, кошт падаткаў за якую ў два разы вышэйшы. Дый даюць толькі да 3 га ў сукупнасьці. А што да маіх аднаклясьнікаў, капітанаў-палкоўнікаў у адстаўцы, то ім голад не пагражае. Жывуць у гарадох, у дзяржаўных з усімі выгодамі кватэрах, атрымліваюць зь бюджэту па 300 і больш тысячаў рублёў пэнсіі.

Высновa — інтэлект у нашай дзяржаве не запатрабаваны, гэтаксама як і ініцыятыва, і творчасьць працоўных мас. Быў і застаецца попыт на людзей у пагонах з ружжом, якія толькі ўмеюць, што сьлепа і бяздумна падпарадкоўвацца і пры магчымасьці падпарадкоўваць слабейшых за сябе людзей. За сябе не скажу больш нічога, за дзяржаву шкада.

**Мікола Яўмененка, Чудзенічы (Лагойшчына)**



# Дзе мяжа Эўропы

**Апошнім часам і першыя асобы краіны, і ТБ узьнялі вэрхал пра знаходжаньне Беларусі ў цэнтры Эўропы.** Усё было б добра, калі б таму адпавядала яшчэ і разуменьне тымі, хто лямянтуе, што такое Эўропа.

Эўропа ў пераважнай большасьці нашых людзей атаесамляецца з дабрабытам і адметнай культурай, якая ядная эўрапейскія народы. Супольныя рысы — гэта найперш талерантнасьць — адсутнасьць нянавісьці й непавагі да прадстаўнікоў іншых культур, веравызнаньняў, нацыянальнасьцяў.

Панятак Эўропы геаграфічнай не адпавядае Эўропе культурнай, Эўропе эканамічнай і г.д. Ці можна казаць, што Беларусь існуе ў геаграфічнай Эўропе? Безумоўна. А ў эканамічнай, а ў культурнай? Штучнасьць нашай культурнай і інфармацыйнай адарванасьці, а хутчэй ізаляцыі — навідавоку.

Немагчыма даведацца, што робіцца ў нерасейскіх суседзяў (як яны жывуць, што іх турбуе, што іх цікавіць). У Расеі? Калі ласка. Уключай ТБ (і не адзін канал) і глядзі альбо слухай радыё FM. Хіба можна ўявіць сабе, што звычайнаму жыхару краіны дадуць магчымасьць націснуць кнопку сваёй «скрыні», каб ён мог убачыць наўпрост перадачы з Кіева ці Варшавы. Ня будзем ужо казаць пра Бэрлін ці Лёндан. Насельніцтва працягвае існаваць у невядомым вымярэньні: быццам бы ў Эўропе, але нешта падобна і на Азію...

**Юры Цехановіч, Менск**

**Мне недаспадобы, што вы друкуеце антыэстэтычныя тэксты Славаміра Адамовіча** (чвяканьне салам з чарвямі, корпаньне ў сьмецьцевым кантэйнэры, расьпіваньне паскуднае гарэліцы зь сьметніку). Гэта будуць чытаць дзеўкі, а? Добра сядзець у Нарвэгіі й мець ганарары ад «НН»!

Ня ўмеючы рацыянальна змагацца з дужэйшым ворагам тутака, гэныя беларусы кідаюцца, як адрацаваны матэрыял, у замежжа. Вядома, куды лепей сядзець на нарах, дарыўце, гарах і цешыцца бітвай тыграў у даліне. Шкада, што добрыя антыкамуністычныя, антыакупацыйныя мазгі выцякаюць за мяжу і швэндаюцца па сьметніках...

**Мікалай Бусел, Дуброва (Сьветлагорскі раён)**

## Прапанова для гісторыкаў і пісьменьнікаў

**Запрашаю беларускіх гісторыкаў (і іншых аўтараў) публікаваць свае працы і кніжкі на сайце Беларускай інтэрнэт-бібліятэкі «Камунікат»** (http://kamunikat.net.iig.pl). Можна гэта рабіць на два спосабы:

1) публікуючы свае кніжкі ў паасобных разьдзелах Бібліятэкі;

2) ствараючы пэрсанальны сайт у Бібліятэцы.

Тэхнічныя справы Вас няхай не турбуюць. Гэтым займецца Бібліятэкар — вэб-майстар сайту. Вам трэба даслаць толькі электронны варыянт Вашых кніжак (1-ы спосаб) ці падрабязную біяграфію-CV, кніжкі, артыкулы, выступленьні на канфэрэнцыях і г.д. (2-і спосаб).

Па падрабязную інфармацыю зьвяртайцеся на адрас: kamunikat@poczta.onet.pl. На сайце «Камунікату» знаходзіцца больш за 250 беларускіх кніжак і часопісаў (у тым ліку гістарычных). Бібліятэка абнаўляецца рэгулярна.

**К-т**

МОВА-2004

# Як называць «аддзелачныя» матэрыялы



Колькі часу таму ў вашай газэце існавала рубрыка, дзе абмяркоўваліся новыя, жывыя і падзабытыя вэрсіі беларускіх словаў, тэрмінаў. Спадабалася дыскусія наконт напісьніка-наморадніка-намызьніка, ва ўласны побыт прыдбаў слова «адчынчык» (кансэрвавы нож). Хацелася б пабачыць на старонках улюбёнага выданьня новыя матэрыялы гэтага кшталту, бо ў штодзённым жыцьці, не гаворачы ўжо пра адмысловыя сфэры, часьцяком не хапае ўласнабеларускіх адпаведнікаў назваў найпрасьцейшых прадметаў і паняцьцяў.

Вось, прыкладам, рабілі мы ў кватэры рамонт, дык першае ж, аб што спатыкнуліся, былі «аддзелачныя матэрыялы». Не беларускае гэтае слова — «аддзелачны». Слоўнікі падаюць яшчэ варыянт «аздобныя матэрыялы», але гучыць ён неяк нязграбна і неадпаведна, бо аддзелка — гэта не зусім аздоба. Ці не маглі б беларускамоўныя чытачы «НН» распавесьці, як яны самі называюць аддзелачныя матэрыялы?

Таксама не зусім ясна наконт словаў «пробка» (электрычны засьцерагальнік), «патрон» (куды ўкручваецца лямпачка), «калодка» (клемная калодка для злучэньня электраправадоў), «кораб» (яго яшчэ называюць «кабэль-канал»; па ім пракладаюць правады), «разэтка», «вілка», «цокаль», «капсуль», «зьмешвальнік» (кран для рэгуляванай падачы халоднай і гарачай вады). Як кароткa і зразумела для людзей, неабазнаных у беларускай філялёгіі, назваць убудаваную кропкавую сьвяцільню, зьмеяпадобную сушылку для ручнікоў (звычайна яны знаходзяцца ў ванных пакоях), замочную шчыліну? Як на ўзроўні аднаго слова правесьці ўпэўненае адрозьненьне паміж шрубай (шурупам), вінтом (бываюць яшчэ вінты з «баранчыкамі», якія закручваюцца пальцамі) і балтом з гайкай (устарэлае слова «ніт»)? Як лексычна адрозьніць засаўку-кран ад засаўкі на дзьвярах? Дарэчы, пра «засаўку». У прыбіральнях звычайна ставяць замкі зь фіксатарам знутры. Зайшоў, зачыніўся, зашчоўкнуў гэты фіксатар і рабі справу. Але як гэты замочны фіксатар назваць па-нашаму? Гэта ня засаўка і ня зашчапка фактычна. Дык што гэта тады? Таксама сантэхнік адрозьніць засаўку ад, напрыклад, шаравога крану.

Як толькі ні называюць у розных сем'ях пульт дыстанцыйнага кіраваньня, напрыклад, да тэлевізара. Я чуў і «балалайка», і «штучка»... У сябе дома мы называем яго проста «пульт». А пэўна ж ёсьць нехта, хто мае лепшае слова, дык няхай бы адгукнуўся. Тое ж прыкладна з прыстасаваньнем для зарадкі акумулятараў сотавага тэлефона. Мы ўзялі польскае слова «ладаварка», а мо магчыма вынайсьці беларускае? Адзін штукар паабяцаў мне «перапрашыць» маю мабілку (мабільнік?), каб мэню было па-беларуску, дык сутыкнуўся з праблемамі перакладу й там. Надта ж груваcткія атрымоўваюцца беларускія варыянты. Але гэта ўжо тэма для асобнае дыскусіі, рады буду пазнаёміць Вас пазьней з сваімі варыянтамі.

**Вацлаў Заякоць, Менск**

ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

# Як Лукашэнка прафкам разагнаў

## Рыгоравіч ігнараваў Працоўны кодэкс яшчэ ў бытнасьць дырэктарам саўгасу



**Аляксандар Шчарбак, старшыня прафкаму саўгасу «Гарадзец» на пачатку 90-х, былы марак гандлёвага флёту.**

Самы пачатак 90-х. Аляксандар Шчарбак, новаабраны старшыня прафкаму саўгасу «Гарадзец», разьбірае дакумэнтацыю. Парушэньняў працоўнага заканадаўства безьліч: у саўгасе няма палажэньня аб аплаце працы; працоўныя ня ведаюць вызначаных урадам тарыфных ставак і расцэнак; адсутнічае графік адпачынку, да яго не далучаюцца нявыкарыстаныя працоўныя дні; праца ў сьвяточныя не аплачваецца ўдвая...

Трэба тэрмінова выпраўляць сытуацыю. Але кіраўнік гаспадаркі й дэпутат ВС Аляксандар Лукашэнка заўвагі саўгаснага прафкаму ігнаруе. Тады раззлаваны Шчарбак друкуе ў прафсаюзнай газэце «Беларускі час» артыкул пад назвай "Як народны дэпутат Лукашэнка разваліў прафкам у асобна ўзятым саўгасе».

Лукашэнка пагражаў аўтару судом, аднак, разважыўшы, з паслугаў Фэміды карыстацца ня стаў. Знайшоўся іншы шлях. А.Шчарбак, пераабраны старшынём на саўгаснай прафканфэрэнцыі, ня змог падпісаць з наймальнікам калектыўную дамову, бо падчас паседжаньня Лукашэнка прапанаваў праект дамовы дапрацаваць. Дэлегаты пагадзіліся, праект трапіў у даўжэзную шуфляду, а прафканфэрэнцыю пасьля гэтага так і ня склікалі.

Шчарбак, шукаючы праўды, зьвярнуўся ў раённы камітэт прафсаюзаў працаўнікоў аграпрамысловага комплексу. Ліст прэзыдыюму райкампрафу сьведчыць пра парадкі, якія панавалі ў гаспадарцы за Лукашэнкам: «У саўгасе «Гарадзец» маюць места парушэньні Кодэксу законаў аб працы, артыкулы 7, 8, 124, 234 і іншыя, а таксама пастаноў Рады Міністраў Рэспублікі Беларусі «Аб чарговых мерах па сацыяльнай абароне насельніцтва і рэгуляваньні аплаты працы», «Правілаў уліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэньні жыльлёвых умоў і забесьпячэньні жыльлёвымі памяшканьнямі ў Беларускай ССР».

У парушэньне артыкулу 234 КЗаП спэцыялісты не падаюць адпаведных дакумэнтаў прафсаюзным работнікам для праверак і падрыхтоўкі пытаньняў на прэзыдыюм.

...Калектыўная дамова на 1992 г. да гэтага часу адсутнічае з усімі яе дадаткамі. Прафсаюзны камітэт саўгасу рэкамэндаваў адміністрацыі загады пра незаконнае ўтрыманьне 25% заробкаў кіроўцаў А.Васільева, В.Грэцкага, што не было зроблена адміністрацыяй.

У саўгасе адсутнічае ўзгоднены з прафкамам загад аб прызначэньні работніка, адказнага за вядзеньне ўліку грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэньні жыльлёвых умоў, па месцы працы.

У сувязі з адсутнасьцю ў саўгасе Палажэньня аб аплаце працы выкарыстоўваюцца старыя нормы, якія ў розных гасразьліковых падразьдзяленьнях розныя. Аклады спэцыялістаў таксама не перагледжаны. Толькі сёлета Рада Міністраў прыняла ў сувязі зь лібэралізацыяй цэнаў дзьве пастановы па сацыяльнай абароне насельніцтва «Аб мінімальным заробку з 1 сакавіка» і «Аб чарговых мерах па сацыяльнай абароне насельніцтва ды аб рэгуляваньні аплаты працы». Аднак, нягледзячы на гэтыя пастановы, аплата працы не была перагледжана. Аплата за працу ў выходныя і сьвяточныя дні ў падвойным памеры, як патрэбна, не рабілася.

Прэзыдыюм райкаму прафсаюзаў нагадвае дырэктару саўгасу «Гарадзец» А.Лукашэнку на недахопы ў працы па заключэньні калектыўнай дамовы, па вядзеньні ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэньні жыльлёвых умоваў, зацьвярджэньні палажэньня па аплаце працы і абавязаў сябра прафсаюзу дырэктара саўгасу «Гарадзец» А.Лукашэнку і старшыню прафкаму А.Шчарбака да 1 чэрвеня прыняць у саўгасе калектыўную дамову з усімі да яе дадаткамі.

В.Сьнегаў, старшыня Шклоўскага райкаму прафсаюзу работнікаў аграпрамысловага комплексу».

Але ні артыкул у «Беларускім часе», ні гэты ліст не дапамаглі. Канфлікт паміж прафарганізацыяй і наймальнікам скончыўся на карысьць апошняга. Аляксандар Лукашэнка проста забараніў пералічваць прафсаюзныя грошы праз бухгальтэрыю. Аляксандар Шчарбак, які застаўся без заробку, быў вымушаны звольніцца з працы. На момант абраньня А.Лукашэнкі прэзыдэнтам краіны прафарганізацыі ў «Гарадцы» не было.

Такі самы прыём быў выкарыстаны і «на высокім дзяржаўным узроўні»: калі Ўладзімер Ганчарык стаў у апазыцыю, пералічваць прафсаюзныя складкі па безнаяўным разьліку забаранілі, пакінуўшы Фэдэрацыю прафсаюзаў бяз грошай. Але варта было толькі зьвіцца паслухмянаму прафсаюзнаму лідэру Леаніду Козіку, як старая сыстэма пералічэньня складак аднавілася.

**Аляксандар Васьняцоў**

АПОШНІ ПІСК


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Танец жывата

Новая мода ў сталіцы: навучацца танцу жывата ў менскіх клюбах каштуе ад 15 да 40 даляраў у месяц (заняткі двойчы на тыдзень). Групы перапоўненыя, запісацца цяжка. Па тэрапэўтычным эфэкце танец жывата пераўзыходзіць нават ёгу, ня кажучы пра шэйпінг ды аэробіку. Ён фармуе цяглліцы і адначасова масажуе ўнутраныя органы, паляпшае кровазварот і гнуткасьць хрыбта.

Моду на танец жывата падагрэлі першы чэмпіянат Беларусі і трэці фэстываль бэлідансу «Ўсходнія слодычы», якія прайшлі ў лістападзе і сьнежні. Фэстываль быў арганізаваны рэстарацыяй «Астара», і ў к/з «Менск» не было вольных месцаў.

На сваёй радзіме, у Сярэдняй Азіі, танец жывата ў заняпадзе. Ісламісцкія настроі ў Эгіпце ў 80-я прымусілі многіх вядомых танцоўшчыц пакінуць сцэну. Некаторым фундамэнталісты нават плацілі за гэта грошы. У фундамэнталісцкіх краінах танец жывата танчаць толькі жанчыны сярод жанчын, і не са сцэны, а ў хаце. Ладная частка сцэнічных танцоўшчыц у Эгіпце — нашы суайчыньніцы і расейкі. Два гады выступала там сёлетняя чэмпіёнка Беларусі, гарадзенка Алена Дзенісенка.

**ВДз**

**На здымку: у фітнэс-цэнтры «Эдэм» заняткі вядзе фіналістка чэмпіянату сьвету па бэлідэнсе 2003 Алёна Корвель (зьлева).**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Сучасны іканапіс

**Выстава «Іканапіс Беларусі XXI стагодзьдзя» адчынілася ў Нацыянальным мастацкім музэі.** Працы дзясятка іканапісных школаў краіны сабрала праваслаўная царква. Адкрыў выставу мітрапаліт Філарэт.

## Сядзіба Касьцюшкі

**Сёлета пад Косавам зьявіцца адноўленая сядзіба Тадэвуша Касьцюшкі.** Ужо гатовы падмурак. На будаўніцтва пойдзе 70 кубамэтраў лесу, для чаго нарыхтоўваюць хвоі 80—100-гадовага веку. Дах будзе крыты трысьнягом.

## Прэмія пісьменьніку-«анімалісту»

**Пісьменьнік Алесь Наварыч узнагароджаны прэміяй прэзыдэнта краіны.** Не за тое, што вывеў прэзыдэнта ў вобразе каровы Рабунькі, а за леташні раман «Літоўскі воўк».

## Калядныя містэрыі ў Віцебску

**У Віцебску з ініцыятывы мясцовай каталіцкай дыяцэзіі адбыўся першы дзіцячы фэст калядных містэрыяў.** Удзел у ім узялі дзесяць самадзейных драматычных калектываў зь Віцебску, Полацку, Гарадка, Мёраў і Лепелю. Спаміж выканаўцаў былі дзеткі ня толькі з каталіцкіх нядзельных школак, але й з пратэстанцкае царквы «Добрая вестка», і самадзейны калектыў зь віцебскай сярэдняй школы №39. Усе ўдзельнікі паказвалі пастаноўкі па-беларуску, толькі з СШ №39 — па-ангельску з сынхронным расейскім перакладам. Для ўдзельнікаў Віцебская дыяцэзія арганізавала абед, а таксама салодкія прызы, мясцовыя ж улады толькі далі дазвол на арэнду залі. На жаль, ніхто з выканаўцаў не прывёз батлейкі. Фэст у Віцебску вырашылі праводзіць штогод.

## Ян Павал II — першы



**«Gazeta Wyborcza» надрукавала сьпісы польскіх бэстсэлераў 2003 г., паводле вынікаў продажаў у найбуйнейшых кнігарнях.**

Першае месца заняў «Рымскі трыпціх» Яна Паўла II (сёлета ён выйшаў і ў Беларусі). Сярод іншых бэстсэлераў-пераможцаў згадваецца модны Паола Каэльё з раманам «Пілігрым». Увайшлі ў сьпіс і нобэлеўскія ляўрэаты — Віслава Шымборска з «Рыфмаванкамі для вялікіх дзетак» і паўднёваафрыканец Джон Максвэл Кутзэе з раманам «Ганьба».

## Дзень вуду

**10 сьнежня ў Бэніне адзначалі нацыянальнае сьвята — Дзень вуду.** На сьвята зьехаліся тысячы прыхільнікаў вудуізму з усяго сьвету: колісь гэтую рэлігію «экспартавалі» разам з рабамі. Сёньня вудуізм, своеасаблівае нэапаганства, узьніклае ў выніку ўплыву хрысьціянства на анімістычныя вераваньні, вельмі распаўсюджаны ў Лацінскай Амэрыцы. У Бэніне культ вуду вызнаюць блізу 80% насельніцтва. Нацыянальным сьвятам Дзень вуду быў абвешчаны ў 1993 г.

**АШ; БелаПАН**

## Ірына Хрупінская ў Стакгольме

**У будынку швэдзкага парлямэнту адчынілася выстава маладой беларускай мастачкі з Магілёва Ірыны Хрупінскай.** На адкрыцьці аўтарка зазначыла, што адной зь яе мэтаў ёсьць, каб праз выставу ўсе швэды заўважылі існаваньне «эўрапейскай краіны Беларусі». Сябра парлямэнту Швэцыі ад вобласьці Кальмар Гокан Югальт зазначыў, што «фантастычна таленавітыя малюнкі Ірыны расплюшчылі нам вочы на характва беларускай зямлі». Выстава арганізаваная дзякуючы беларуска-швэдзкаму праекту «Кальмар—Магілёў». Малюнкі можна скапіяваць у Інтэрнэце: http://www.belarus.nu/

**Андрэй Катлярчук, Стакгольм**

# На разьвітаньне зь беларускім Калюмбам



«Божа, не асудзі яго! Ты ж нарадзіў яго на зямлі нашай».

(Я.Юхнавец, з паэмы «Калюмбы»)

На Каляды ў адным з шпіталяў Нью-Ёрку пакінула гэты сьвет душа арыгінальнага беларускага паэта Янкі Юхнаўца. Стан глыбокай комы, у якой ён перабыў ажно два гады, скончыўся разам зь яго фізычнымі магчымасьцямі. Застаўся дух... Янка Юхнавец — мастак своеасаблівы, творца моўны (і ўмоўны — таксама). Ад зьняменьня перад вечным жыцьцём да пошуку найменьняў яму прамінуў яго чалавечы век. Можа, таму і маўленьне яго было падобнае да маленьня. Амаль дакладна ўгадаў да**моўны** стан старэйшага калегі Алесь Разанаў яшчэ ў 1965 г.:

І ціш і гром,
і звон і шорах
спляліся ніткаю радзтва, —
калі з грудзей,
нямых і чорных,
аднойчы мова прарасла.

Гэтак жа «вырастала» і паэзія Янкі Юхнаўца. У 1955 г. выйшаў у сьвет першы зборнік паэта «Шорах моўкнасьці». Усё астатняе сталася працягам яго... «Мінулае ўспомні, калі ня будзе будучага», — прарочa напісаў ён калісьці як для нас, цяперашніх.

Яго чалавечы і творчы знак быў і застаецца ў красным айчынным пісьменстве мэтафарай глыбіннай філязофскай моўкнасьці. Ды ён і не пісаў, а ствараў свае паэтычныя анімацыі — выдыхам, мімікай, жэстамі — патаемным шрыфтам прамацярынскай мовы (своеасаблівым мэтадам да**мовы** зь ёй)...

І вось — выказаўся канчаткова. Да поўнага маўчаньня. Нямеем і мы. Ёсьць толькі «шорах моўкнасьці»... І — яго «Ода рыдлёўцы» на ўласны адыход:

О, мая жалезная сяброўка,
табе танклявая, прыгожанькая Муза
йшчэ не сьпявала віншавальных одаў:
баіцца, каб чароўненькія вочкі
ты не засыпала пяском,
каб пантофляў, з шоўку шытых,
ты не забрудзіла зямлёй.
Затое я табе пяю:
о, ты сваёй жалезнай жменяй
засып памерлых між жывых,
каб жыць магло усё жывое.

**Леанід Галубовіч**

## Замест хаты Быкава — муляж

**Вушацкія ўлады вырашылі адкрыць музэй на радзіме Васіля Быкава ў вёсцы Бычкі да ягонага 80-годзьдзя (19 чэрвеня 2004 г.). Ён разьмесьціцца ў доме, дзе нарадзіўся і жыў пісьменьнік. Што праўда, сам дом зьнясуць (ён, маўляў, у надта кепскім стане), а на ягоным месцы паставяць дакладны муляж. Уласна ад Быкава застанецца на сядзібе толькі клён і дуб, пасаджаныя пісьменьнікам.**

**На фота справа: гэтай хаты больш ня будзе.**


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Адышлі легенды



**У Нью-Ёрку ў сваім доме памерла 90-гадовая легендарная гейша Кігару Накамура, якую наведваў Чарлі Чаплін падчас сваіх японскіх гастроляў.**

Гейшай Кігару стала ў шаснаццаць гадоў: сьпявала, танчыла і забаўляла мужчын у эксклюзыўных рэстарацыях. У 1956 г. перабралася ў ЗША, дзе навучала ахвотных японскім танцам і спевам. У 80-гадовым веку выдала мэмуары «Ўспаміны такійскай гейшы». «Ша» па-японску азначае «тая, што забаўляе», а «гей» — «артыстычна».

У Стакгольме ж у 74 гады памерла акторка Інгрыд Тулін, якая здымалася ў фільмах Інгмара Бэргмана «Сунічная паляна», «Твар», «Маўчаньне». Сцэнічным амплюа гэтай «халоднай бляндынкі» былі моцныя разумныя кабеты. Апроч фільмаў Бэргмана здымалася таксама ў Люіджы Вісконці («Сутоньне багоў»), дый сама займалася рэжысэрствам.

# Прэзэнтацыя кнігі Адважнага

**Можна напісаць «Архіпэляг ГУЛАГ» раней за Салжаніцына й застацца практычна невядомым. Асабліва — беларусу. Сьведчаць пра гэта ня толькі «Ў капцюрох ГПУ» Францішка Аляхновіча, але й кніга ўспамінаў Язэпа Германовіча «Кітай — Сібір — Масква», напісаная ў 1962 г.**

Складаны быў ягоны шлях: у 30-я айцец патрапіў у Харбін, адкуль у 48-м кітайскія камуністы выдалі яго саветам — як «японскага шпіёна». Потым былі лягеры, адкуль вызваліўся ў 55-м і якія апісаў у сваёй кнізе «Кітай — Сібір — Масква».

У Беларусі ўспаміны айца Германовіча выйшлі пры канцы 2003 г. дбаньнем грэка-каталіцкай суполкі й грамадзкага аб'яднаньня «Дыярыюш». Прэзэнтацыя адбылася 8 студзеня ў памяшканьні музэю Янкі Купалы ў Менску.

Як распавёў Янка Трацяк, аўтар прадмовы да кнігі, творы Германовіча не маглі патрапіць да чытача ня толькі ў савецкі час, але і ў пэрыяд «перастройкі»: лічыліся занадта дыдактычнымі й маламастацкімі. Галоўны дасьледнік творчасьці беларускай эміграцыі Барыс Сачанка так і адказаў Анатолю Сідарэвічу на пытаньне: «Калі перавыдасьце творы Германовіча?»

Пісаць Германовіч пачаў з блаславеньня Максіма Гарэцкага — пісаў і прозу, і вершаваныя апавяданьні (удавалася горай). Мастацкія творы друкаваў пад псэўданімамі Вінцук Адважны й Лявон Ветрагон. Напісаў аповесьць «Хлапец» — першы ў беларускай літаратуры твор, галоўны герой якога выступае ня толькі як сьвядомы беларус, але й падкрэслены католік. Пераклаў з расейскай «Канька-гарбунка» Яршова. Меўся выдаць вершаваную Біблію па-беларуску й нават напісаў некалькі першых разьдзелаў (надрукаваў у часопісе «Божым шляхам»). Апроч усяго пісаў рэлігійныя казані й краязнаўчыя нататкі...

Я.Трацяк пэўны, што спадчына Германовіча, выдадзеная зборам твораў, заняла б ня менш як тры-чатыры тамы. Пакуль што выйшаў адзін.

Пасьля самой прэзэнтацыі адбылася мастацкая вечарына з танцамі ды песьнямі. Алёкса Галіч сьпяваў духоўныя песьні, уніяцкі сьвятар Андрэй Абламейка танчыў падэспань, а адной зь дзяўчат нават удалося выцягнуць у кола танцораў прафэсара Юр'я Хадыку, які зазначыў: «Не баіцца ж яна зь мядзьвядзем танцаваць».

**Адам Воршыч**



Язэп Германовіч

ДЫСКАГРАФІЯ

## Лодочки

Безь Білета, 2003

Менскі гурт «Безь Білета» выдаў відэамаксы-сынгл «Лодочки» — першы такога кшталту прадукт у гісторыі беларускага шоў-бізу. У дыск увайшлі два самыя новыя кліпы каманды — «Нарисована» і «Лодочки», плюс два відэаэпізоды да песьні «Stop Business» — анімацыйны і «рэміксавы». Да ўсяго, можна пабачыць тры жывыя выступы «ББ» розных часоў. Апошняе — для шалёных прыхільнікаў, бо гук і карцінка жудасныя (акром кінахронікі з «Рок-каранацыі»).

Разынка дыску — дзівацкі кліп на песьню «Лодочки», зьняты малымі сіламі, без спэцэфэктаў, дэкарацыяў, масоўкі і г.д. Толькі Ён, Яна ды горад з фантанамі, крамамі, плошчамі й паркамі... Густоўна. А вось відэапраца на песьню «Нарисована» пэўна трапіць у архіў. Тры хвіліны апэратар мітусіцца з камэрай на заднім сядзеньні таксоўкі, здымаючы вячэрні праспэкт Скарыны...

Лідэр групы Віталік «Артыст» асабіста запісаў увесь наклад сынглу ды працумараваў кожны дыск. Усяго атрымалася 77. Некалькі дыскаў будуць зь сюрпрызамі: так, у №13 укладзены запрашальнік на найбліжэйшы канцэрт «Безь Білета». Замовіць сынгл можна праз сайт групы www.bezbileta.com.

Рыхтуецца й выданьне паўнавартаснага альбому каманды — «Нарисована». З часоў плыткі «На неба» стылістыка ды склад гурту зьмяняліся. Беларускамоўныя песьні зусім зьнiклі з рэпэртуару «Безь Білета», а Віталік просіць журналістаў пісаць назву групы бязь маккага знаку…

**Сяргей Будкін**

### «Viza NRM». Працяг будзе

**Другая частка трыб'юту, прысьвечанага творчасьці гурту «NRM», мае выйсьці сёлета і быць больш прадстаўнічай за першую.** Удзел у ім возьмуць «Нэйра Дзюбель» (яны абралі песьню «Лалала»), «Indigo» («Паветраны шар»), Валік Грышко. Ёсьць імавернасьць, што свае песьні запішуць «Стары Ольса» і «Ляпіс Трубяцкой». Праект можа стацца інтэрнацыянальным: гурт з Ольштына «Triquetra», прызэр «Басовішча'2003», ужо зрабіў сваю песьню, магчымы ўдзел украінскага «Тартаку». «Сьпяшацца з выхадам дыску ніхто ня будзе», — кажа ініцыятар праекту Віталь Супрановіч. Прэзэнтацыя чакаецца ў другой палове 2004 г. Між тым, першая «Viza NRM» уваходзіць у тройку самых прадавальных беларускіх дыскаў.

### Скарыны разьлятаюцца па сьвеце

**7 студзеня Лукашэнка ўручыў ордэн Францішка Скарыны францускаму мадэльеру П'еру Кардэну,** а праз 2 дні — прэзыдэнту ўкраінскай Акадэміі навук Барысу Патону.

### Юбілей Рэфармацыі працягваецца

**450-годзьдзе Рэфармацыі ў Беларусі, якое адзначалася сёлета, плаўна пераходзіць у 451-годзьдзе.** На 2004 г. перанесеныя мерапрыемствы, якія не ажыцьцявіліся ў пару. У Койданаве будзе ўсталяваны памятны знак на месцы зьнішчанага кальвінскага збору. Дакумэнты ў райвыканкам жыхары-пратэстанты падалі яшчэ ў верасьні, але адказу няма. Плянуецца таксама выдаць Катэхізіс Сымона Буднага сучаснай мовай. Пераклаў яго група энтузіястаў-пратэстантаў на чале з кандыдатам філялягічных навук Н.Кабелкай.

### Рыцарскі часопіс

**З гэтага году ў Беларусі пачне выходзіць часопіс-квартальнік рыцарскага руху «Сьвет сярэднявечча». №1 выйдзе напярэдадні рыцарскага фэсту «Белы замак».** Яго зьмест складуць музычны агляд, прэзэнтацыі сярэднявечных гуртоў, агляд моды, невядомыя старонкі з гісторыі Сярэднявечча. Згоду на супрацоўніцтва са «Сьветам» далі гісторыкі Ўладзімер Арлоў і Юры Бохан. Паводле падлікаў Ордэну Паўночнага Храму, патэнцыйных чытачоў — прыхільнікаў рэканструкцыйнага руху — у Беларусі каля трох тысячаў.

Ордэн Паўночнага Храму — найстарэйшы ў краіне рыцарскі клюб. Займаецца гісторыяй тампліераў і лічыцца найлепшым у Эўропе па тым пэрыядзе. Сёлета ордэн атрымаў пад апеку сапраўдны будынак камандорыі тампліераў у Польшчы — за тое, што знайшоў там фрэскі і выратаваў будынак ад рабаўнікоў, якія шукаюць золата ў старажытных тампліерскіх схованках.

### Кнігі «НН» на pravapis.org

**Кніжны рэйтынг «НН» (№48'2003) перадрукаваў сайт pravapis.org.** Агляд аздоблены выявамі вокладак згаданых кніг ды кароткім рэзюмэ па-ангельску. Гэты інтэрнэт-рэсурс, які з 2001 г. робіць Уладзімер Катказоўскі (ён жа — rydel), прысьвечаны беларускай мове ў разнастайных яе аспэктах. Pravapis.org мае ня толькі беларускія, але й ангельскія матэрыялы. Апошняе ангельскае абнаўленьне — артыкул «Акадэмік Яўхім Карскі», які ў 1967 г. напісаў Арнольд Макмілін для часопісу «The Journal of Byelorussian Studies».

### Год Польшчы ва Ўкраіне...

**…пачнецца 1 красавіка. З такой ініцыятывай выступіў Аляксандар Квасьнеўскі падчас візыту ва Ўкраіну.** Арганізацыяй займаецца Інстытут Адама Міцкевіча. Важнымі пунктамі сьвята маюць стаць Міцкевічаўскі Крым і Крамянец Юльюша Славацкага. У Кіеве рыхтуецца адкрыцьцё музэю Міцкевіча, а ў опэры — прэм'ера «Страшнага двара» Станіслава Манюшкі. Адбудуцца таксама паказы польскіх фільмаў, пройдуць выставы мастакоў Польшчы, у тым ліку й беларуса Лявона Тарасэвіча. Папярэдне падлічаныя выдаткі Польшчы на гэтыя мерапрыемствы складуць 3 млн злотых. Наступным пасьля году Польшчы ва Ўкраіне будзе год Украіны ў Польшчы.

**СБ, АВ, ДЗ**

## «Залаты век» у Музэі Багдановіча

**У Літаратурным музэі Максіма Багдановіча ў Менску да 20 студзеня працуе мастацкая выстава «Залаты век Беларусі». На выставе каля 30 твораў (жывапіс, гравюра, ткацтва, габэлен, скульптура) Уладзімера Стальмашонка, Арлена Кашкурэвіча, Аляксея Марачкіна, Міколы Купавы, Рыгора Сітніцы, Сяргея Гумілеўскага, Лявона Грышука, прысьвечаных 450-годзьдзю Рэфармацыі.**

**БТ**




НОВЫЯ КНІГІ

**Бугаёў Дз. Служэньне Беларусі:** Прабл. артыкулы, літ. партрэты, эсэ, успаміны. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 381 с.

У выданьні зьмешчаныя матэрыялы, датычныя жыцьця й творчасьці В.Ластоўскага, У.Дубоўкі, М.Зарэцкага, І.Мележа, У.Караткевіча, В.Быкава ды інш. Цана ў кнігарнях — 5700 руб.

**Бутрым В. Паралелі**: Вершы і паэмы. — Баранавічы: ГА «Творчае згуртаваньне «Сьвятліца», 2003. — 88 с.: іл. 500 ас.

Другі па ліку зборнік баранавіцкага паэта пабачыў сьвет ужо пасьля сьмерці аўтара. Малюнкі — таксама Бутрымавы.

**Дапаможнік маладафронтаўца па мэнэджмэнце арганізацыі.** — Менск, 2003. — 54 с.

Матэрыялы, зьмешчаныя ў брашуры, дапамогуць сябрам NGO засвоіць мастацтва лідэрства — навучыцца плянаваць уласную дзейнасьць і дзейнасьць арганізацыі, разьмяркоўваць абавязкі, шукаць спонсараў і г.д.

**Лагвіновіч І. Ляда Юдолі:** Выбранае / Уклад. і прадм. Л.Галубовіча. — Баранавічы: ГА «Творчае згуртаваньне «Сьвятліца», 2003. — 76 с. 100 ас.

У зборнік 62-гадовага паэта ўвайшлі новыя творы, а таксама вершы зь дзьвюх папярэдніх кнігаў — «Разлукі выраёвыя» і «Піліпаўка».

**Станкевіч Ю. Сатырыкон** / Маст. А.Пушкін. — Менск, 2003. — 84 с. 500 ас.

Сатырычныя творы, сабраныя ў кнізе, вяртаюць у апошнія гады існаваньня савецкай дзяржавы. Напаўзабытыя рэаліі пэрыяду разьвітога сацыялізму й перабудовы — помнікі правадыру, кастрычніцкія сьвяты, райкамы, палітасьвета, першыя каапэратывы, гарэлка па талёнах і г.д. — сёньня выклікаюць проста крывыя ўсьмешкі, а вось характары людзей, абмаляваныя ў апавяданьнях, прымушаюць задумацца, ці шмат зьменаў адбылося з тых часоў у сьвядомасьці грамадзянаў Беларусі.

**Філяматы**: Бюлетэнь Рэсп. ГА «Таварыства аматараў ведаў (філяматаў)» / Рэд. Ю.Хадыка. — 2003. — № 2(5). 299 ас.

Выданьне таварыства філяматаў набывае сталую пэрыядычнасьць. У чарговым нумары — грамадзка-палітычная аналітыка Ю.Хадыкі, артыкул акадэміка Р.Гарэцкага «Ці багатая Беларусь на мінэральныя рэсурсы», дзе даводзіцца, што нашая дзяржава па забясьпечанасьці сыравінай не саступае большасьці эўрапейскіх краінаў.

**Філяматы**: Бюлетэнь Рэсп. ГА «Таварыства аматараў ведаў (філяматаў)» / Рэд Ю.Хадыка. — 2003. — № 3(6). 299 ас.

Бюлетэнь адкрывае артыкул В.Голубева «Беларуска-расейскія адносіны: гістарычны вопыт і новыя падыходы». Шэраг матэрыялаў прысьвечаны дзяржаўнай ідэалёгіі.

**Шахматы-плюс:** Незал. інфарм.-асьвет. выд. — 2003. — № 1. 299 ас.

Пасьля звальненьня Вольфа Рубінчыка з пасады галоўнага рэдактара выдадзенага ў ліпені 2003 г. часопісу «Шахматы» — першага ў Беларусі спэцыялізаванага пэрыёдыка ў гэтай галіне — творчы калектыў заснаваў альтэрнатыўнае, пакуль не зарэгістраванае шахматнае выданьне. Ранейшыя мэты і задачы захаваныя, як і высокая якасьць матэрыялаў, як і беларускамоўнасьць. Замовіць можна праз: 220068, вул.Кахоўская 34-14, e-mail: rubinchyk@lycos.com.

**Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795—2002 г.).** — Менск: Энцыкляпэдыкс, 2003. — 490 с. 1500 ас.

Даўно чаканае выданьне пра новую і найноўшую гісторыю краіны.

**Донцов Д. Туга за героїчним: Постаті та ідеї літературної України**. — Київ: «Веселка», 2003. — 101 с. 25000 ас.

Аўтар кнігі (1883—1973) вядомы найперш як публіцыст і непахісны ідэоляг украінскага нацыяналізму. Тры найвыбітнейшыя постаці ўкраінскае літаратуры — Леся Ўкраінка, Тарас Шаўчэнка й Іван Франко, паяднаныя, на думку дасьледчыка, тугою па гераічным і ўпэўненасьцю ў перавазе нацыянальных ідэалаў над клясавымі. Кніга прызначаная для старшага школьнага веку, і выдавецтва абвяшчае сярод чытачоў конкурс эсэ. Выклаўшы свае думкі адносна працы Данцова, маладзёны могуць атрымаць грашовую ўзнагароду. Такім мэтадам выхаваньня патрыятызму не пашкодзіць павучыцца й нам.

**Czasopis**. — 2004. — № 1.

Беластоцкі «Часопіс» прапануе беларуска- й польскамоўныя матэрыялы, прысьвечаныя палітыцы, гісторыі, літаратуры й мастацтву: Сакрат Яновіч дзеліцца перадкалянднымі развагамі; Павал Мажэйка распавядае пра ўсталяваньне помніка Ларысе Геніюш. Нумар зьмяшчае каляндар, ілюстраваны каляровымі рэпрадукцыямі твораў Пётры Сергіевіча. «Czasopis» можна чытаць праз Інтэрнэт (www.slonko.com.pl/czasopis).

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Ціхая акупацыя

**«Мы тут жывём. Так здарылася. Хтосьці імкнуўся сьвядома, хтосьці меў намер правесьці тыдзень-другі, ды вось і застаўся. У кагосьці на руках ужо і расейскі пашпарт, а хтосьці на запыт мянта паказаць дакумэнты прызвычаена цягнецца ў кішэню. Па сторублёўку, бо нават рэгістрацыі няма.**
**Кажуць статыстыкі, нас вельмі шмат у Маскве. Толькі нешта паводзім мы сябе ціха. І не чуваць нас, і не відаць. Я неяк пажартаваў, што гэта ў нас акупацыйная палітыка такая: прыяжджаем мы сюды тысячамі незаўважанымі, працуем, займаем становішча ў грамадзтве, пасады, але аднойчы карэннае насельніцтва прачнецца — а мы ўжо і пры ўладзе, і абʼявілі Расею часткай Беларусі...»**
**Гэтак рэпрэзэнтуе свой праект «Беларуская Масква» журналіст Віктар Дзятлікові, які ў 1996 зьехаў у Расею. «НН» прапануе чытачам колькі гісторыяў аб посьпехах і паразах тае ціхае акупацыі.**



АРЦЁМ ЛЯВА

## Сьмятана

Працаваў я неяк у газэце «Московские новости». Не апошнім чалавекам у рэдакцыі была добрая армянская жанчына Ганна Мікіцічна. Аднойчы прыйшла яна на працу вельмі ўзрушаная. Аказалася, што напярэдадні выклікалі яе ў школу. Нашкодзіў сын.

Хлопчык, як і ўсе дзеці, памыляўся ў дыктоўках, але чамусьці толькі ён адзін не хацеў гэтага прызнаваць. Ганна Мікіцічна ўзяла сшытак сына. У тэксьце пабачыла слова, якое і выклікала столькі спрэчак: «смятана».

— Што ж ты, сынок, мяне ганьбіш, — ужо дома зьвярталася яна да сына, — як можна спрачацца з настаўніцай, калі ты памыліўся!

— Не было памылкі, — адказаў сын.

— Ну як не было, калі пішаш «смятана» замест «сметана».

І тут сын узяў маці за руку, падвёў да халадзільніка, адчыніў. На паліцы стаяла плястмасавая скрыначка з запаветным прадуктам. «Смятана» — вялікімі літарамі па-беларуску было на ёй надрукавана.

Сьмятану сямʼя заўжды купляла ля беларускага вакзалу, дзе гандлявалі клуначнікі з-пад Воршы ды Магілёва.

## Сторублёвая рэгістрацыя

Не разумею, навошта станавіцца на консульскі ўлік у беларускай амбасадзе. Раз на чатыры гады можна і ў Менск зьезьдзіць прагаласаваць. А мой сябар Валера стаў. У пашпарце зьявіўся адпаведны штамп. І ўжо праз тыдзень той штамп з задуменным тварам вывучаў маскоўскі міліцыянт Пятрэнка, шукаючы пазнакі пра рэгістрацыю.

— Якую, — зьдзіўляецца Валера, — рэгістрацыю Вам паказаць? Вы што, ня бачыце, што я дыпляматычны работнік?

— У дыпляматаў мусіць быць нейкі іншы пашпарт.

— Можаце арыштаваць, але я Вас папярэдзіў, што валодаю дыпляматычнай недатыкальнасьцю.

Пасьля тых словаў вагаўся Пятрэнка нядоўга: чорт іх разьбярэ, мо і сапраўды дыплямат.

Адпусьціў.

Лёгкая перамога.

Было з Валерам і іначай. Тая ж просьба паказаць рэгістрацыю. Тая ж адмова — маўляў, якая рэгістрацыя, калі саюзная дзяржава. Але міліцыянт папаўся такі, што грошы паважае больш, чым беларусаў. Пасадзіў у ПАЗік, сам сышоў яшчэ налавіць нелегалаў, а верны сябра мянтоўскі застаўся. Гісторыя не засьведчыла, як яго звалі, — мо Тузік, мо Мухтар, але падобны ён быў на Немінучую Сьмерць.

Вы адчувалі калі-небудзь, як страх напаўняе вас? Нараджаецца недзе ў галаве, потым хапае за сэрца, рукі нямеюць, а ногі і так ужо даўно дрыжаць. І арганізм ваш выпрацоўвае нейкую гадасьць, на якую гэтыя паскуды рэагуюць — адчуваюць, што вы іх баіцёся.

Вось і гэты адчуваў. Стаяў ашчэрыўшыся. На кожны ледзь бачны Валераў рух рэагаваў проста — рабіў невялікі крок наперад ды яшчэ больш іклы паказваў. Сьліна капала.

Міліцыянт зазірнуў у аўтобус толькі хвілінаў праз пятнаццаць.

— Ну што, штраф ці зноў правы будзем качаць?

Сто рублёў перайшлі ў мянтоўскую кішэню.

Параза была поўнай.

Лік параўняўся.

## Барада — прыкмета Шандаровіча

22 чэрвеня ў Астанкіне сустрэў «нашага чалавека» Віктара Шандаровіча. Напярэдадні ўначы Міністэрства друку адключыла тэлеканал ТВС, да якога мы абодва мелі нейкае дачыненьне. Гляджу — у адрозьненьне ад мяне, ён у гуморы. Распавядае: некалькі гадзінаў таму патэлефанавалі яму з тэлеканалу РТР. Запрасілі на ток-шоў у якасьці экспэрта. Тэма шоў: «Барада — прыкмета розуму». Гэтую тэму дзяржаўны тэлеканал з аўдыторыяй 150 мільёнаў чалавек зьбіраўся абмяркоўваць гадзіну.

Мяне ў гэтай сытуацыі радуе адно: нашыя людзі маюць на расейскае грамадзтва ўжо такі ўплыў, што, пазбаўляючы іх працы, дзяржава тут жа прызнае, што робіць гэта выключна дзеля іх розуму. А вось былі б дурнямі...

## Всех уничтожим

Гісторыя ад Таісы Мішчанкі.

На каталіцкі Вялікдзень 1997-га ці 1998-га я ішла ў касьцёл Сьв.Людвіка на імшу. Беларусь і Расея рыхтаваліся ці то да нейкага чарговага яднаньня. Здаецца, на Марасейцы чакалі прыезду нейкай афіцыйнай асобы. Стаяў невялікі натоўп: людзі сталага веку трымалі ў руках чырвона-зялёныя сьцяжкі і самаробныя плякаты, што заклікалі да славянскай еднасьці зь Беларусяй. Асабліва вылучаўся чарнявы хлопец гадоў сарака, з выразна паўднёвым, неславянскім абліччам, з кавалкам мэталёвага ланцуга ў руцэ. Абмінаючы хлопца, я падышла да прыемных жанчын сваіх гадоў з намерам мірна растлумачыць, што яны памыляюцца, што беларусы — за тое, каб з Расеяй па-суседску сябраваць, а не абʼядноўвацца. Пікетоўцы мне дружна заявілі: «А мы вас всех уничтожим! Белоруссия всё равно будет наша». Славянская еднасьць і добрае стаўленьне да беларусаў працуюць толькі тады, калі беларус добраахвотна адмаўляецца ад сваіх беларускіх правоў. Ну верыце? Ну паспрабуйце прывучыць да беларускай мовы сваіх дзяцей у расейска-беларускай маскоўскай сямʼі. Цяпер нават нацыянальнасьць нідзе не фіксуецца. Застаецца толькі мова... Здыму капялюш перад тым, у каго ўдасца...

## Украінскі Менск

Трэба мне было адправіць заказны ліст у Менск. Прыходжу на пошту і прашу ў дзяўчынкі ў акенцы капэрту — маўляў, ліст дасылаць у Менск трэба. Дзяўчынка — маладзенькая такая — глядзіць на мяне і з разуменьнем адказвае: «А, ва Ўкраіну». — «Ды не, — кажу, — Менск — гэта сталіца Беларусі». Здаецца, яна моцна зьдзівілася. А магчыма, у сучасных маскоўскіх школах гэтага ўжо й не вывучаюць.

## Тарас Бульба і Ляпіс-Трубяцкой

Міхаіл Румін, дырэктар кансалтынгавае фірмы і карэнны масквіч, распавядаў: «У сеткі рэстарацыяў «Карчма «Тарас Бульба», якая радуе нас, маскалёў, даволі прыстойнай украінскай кухняй, 80% часу гучыць цудоўная музыка ў выкананьні... «Песьняроў», «Ляпіса», «Лепрыконсаў» ды іншых выключна ўкраінскіх калектываў. Мушу зазначыць, што нас, маскалёў, гэта бязьмежна радуе. Таму што няма нічога больш прыемнага, чым піць расейскую гарэлку, закусваць украінскім салам ды слухаць цудоўныя беларускія баляды. Усім дзякуй!».

## Беларускі зяць

Дзяўчына Даша — масквічка. І бацькі яе — масквічы ў чацьвертым ці пятым калене. Людзі інтэлігентныя і культурныя. Але аднойчы маці ня вытрымала. Бо лёс зьвёў Дашу зь беларусам Уладзіславам. А праз яго і са мной. А праз мяне з Валерам. І так здарылася, што нейкім днём мы паасобку патэлефанавалі ёй цягам гадзіны-дзьвюх.

Маці, якая здымала слухаўку, спакойна адрэагавала на Ўладзіслава (і так кожны дзень тэлефанаваў) і нават на мяне (у твар ведала). Але пасьля тэлефанаваньня Валеры, прычым з тым жа, што і ў нас, акцэнтам, зайшлася пытаньнем-крыкам:

— Няўжо ў Маскве не засталося ніводнага хлопца, які б ня быў беларусам?!!

## Нацыя аўтаперагоншчыкаў

У Маскве вельмі шмат машынаў зь беларускімі нумарамі. Я нейкі час, як толькі ўладкаваўся ў Маскве, быў пэўны, што гэта ўсё нашыя людзі. Неяк дарогу пераходзіў, і ледзь не пакалечыў мяне адзін такі беларус. «Братка, што ж ты робіш», — накінуўся я на кіроўцу па-беларуску. «Чиво-чиво ты гаваришь?» — з машыны высунуўся зьдзіўлены твар прадстаўніка нейкага сяброўскага каўкаскага народу. Пазьней мне патлумачылі, што чырвона-белыя нумары — гэта не праява экспансіі беларусаў, а вынік працавітасьці беларускіх аўтаперагоншчыкаў.

Ва ўяўленьні расейцаў беларусы паступова ператвараюцца ў нацыю аўтаперагоншчыкаў. Уладзіслаў неяк зламаў машыну, каб даехаць дадому. Звычайная падарожная размова: «Зь Менску?.. Мне адтуль машыну гналі... Паскуды, падвысілі мыты на замежныя машыны, цяпер даражэйшымі будуць... Самі б спачатку рабіць навучыліся... Прыехалі? 100 рублёў зь цябе. Ну, бывай». А машына, трэба сказаць, была «Вольва», ды нейкае рэдкае мадэлі. Туды-сюды Ўладзіслаў торкнуўся, а ня можа клямкі знайсьці, каб дзьверы адчыніць.

— Эх ты, а яшчэ беларус, — падаў голас кіроўца, — беларусы мусяць ведаць, дзе ў любой машыны дзьверы адчыняюцца...

Неяк сябар мой Ігар забыўся памыць машыну. На ёй беларускія нумары. Сустрэліся мы недзе ў горадзе. Гляджу на ягоны капот і бачу: пальцам па пыле выведзена «Жыве Беларусь». Ігар нават не заўважыў, калі зьявіўся надпіс. Падпольле дзейнічае.

**Паводле www.maskva.com**

# Чужыя на Бацькаўшчыне

**Каляды для мяне, як этнічнага беларуса з-за мяжы Беларусі, зьвязаныя перадусім з падарожжам на Бацькаўшчыну, да бабуляў і дзядуляў. Звычайнае шчасьце, даступнае савецкаму дзіцяці. Але клясычны сюжэт Гамэра — не пра нас. Праўдзівы лёс Уліса напаткаў беларусаў, якія па вайне апынуліся на далёкім Захадзе ці Ўсходзе. Большасьць эмігрантаў павярталася на Радзіму толькі ў снах. Некаторым пашанцавала праз 50 гадоў зноў убачыць родны кут.**

**Беларуская літаратура стварыла культ вёскі. Між тым для значнай часткі нашага народу Бацькаўшчынай ёсьць роднае мястэчка. Ужо ў XVI ст. Вялікае Княства Літоўскае зь яго 400 гарадамі і мястэчкамі было самай урбанізаванай краінаю Эўропы. Тураў, Крэва, Давыд-Гарадок, Гальшаны, Глуск, Друцак... Калісьці гэтыя гарады квітнелі, а сёньня параблiся мястэчкамі, у якіх веліч гісторыі ажывае толькі ў гутарках старых ды ў вечна халодным ветры на замкавай гары. Штогод меншае старых, меншае натоўп пасажыраў менскага аўтобуса, што едуць на Каляды слухаць гутаркі бацькоў ці дзядоў пад кілішак гарэлкі з смачнай ячэняй, сальцісонам ды кілбаскамі. Здаецца, памруць старыя — і зьнікне мястэчка. Але пакуль яно жыве. Дзе мястэчка — там плошча з царквою, касьцёлам ды домам малітвы, чыгуначнай альбо аўтобуснай станцыяй. Дзе станцыя — там шыльда з назваю, якую ніколі не забудзеш. Старая ацынкаваная шыльда з іржавымі літарамі — першы відок малой Радзімы вачыма «беларуса-гарадчука».**

**У сьнежні 1989 году ў купэ цягніка Бранск—Берасьце, які з 1864 году спраўна вяртае дахаты беларусаў-палешукоў зь Сібіры й Далёкага Ўсходу, я сустрэў першага Уліса. Усю дарогу да Жыткавіч ён ня мог супыніцца, распавядаў пра вандроўкі свайго жыцьця. Звычайны палескі лёс парушыла сталінская зачыстка. У 1936-м бацьку і маці забілі чэкісты. З пункту гледжаньня чырвоных, было за што. Жыла сям'я заможна, на хутары, ля самай мяжы, «пяцьсот мэтраў ад плоту». Бацька — лясьнік ды яшчэ каталік. «Шпег, вядома». У тую самую зіму пад Туравам жаўнеры НКВД бязьлітасна зьнішчылі за «шпігунства» шляхецкую вёску Багушы. Наш хлопец апынуўся ў Жыткавіцкім дзіцячым доме. У час вайны разам зь сябрам дабраўся да Мурманску, спрабаваў уцячы на караблі хаўрусьнікаў у Амэрыку. Быў схоплены. ГУЛАГ. Па ГУЛАГу адшукаў адну сястру з чатырох, якіх меў калісьці. Астатак жыцьця пражыў адзінцом на Сахаліне, дзе, як паведаміў з гонарам, першым навучыў тамтэйшых вырошчваць бульбу. Пад старасьць пачаў сьніцца родны кут. Сны не давалі спакою. Ён сышоў на станцыі Жыткавічы / Жыдкавічы, ня ведаючы, ці сустрэне знаёмы твар, дарогу, хату.**

**Другім разам я спаткаў Уліса ў 1995 годзе ва ўтульным пакойчыку гатэлю «Беларусь». Мы, беларусісты з усяго сьвету, пілі разам каньяк ды гаманілі да раніцы. Але адзін наш заходні калега не хмялеў ды ўвесь час моцна хваляваўся. На маё зацікаўленае пытаньне да польскай беларускі яна коратка адказала: «Яму а пятай на гарадзенскі цягнік ды ў роднае мястэчка, зь якога ён зьехаў сямігадовым хлапчуком». Натуральна, пасьля пяцідзесяці гадоў аўстралійскай чужыны дзядзька сьмяротна баяўся вяртаньня да мясьцінаў дзяцінства. Бо рэчаіснасьць была ў стане разбурыць пранесены праз усё жыцьцё казачны сьвет дзяцінства. Падчас наступнай сустрэчы я ня вытрымаў ды запытаў яго — як зьезьдзіў? «Добра, — спакойна адказаў ён. — Рэчка і неба такія ж чыстыя. Хаты стаяць, як у скансэне... Але я нікога не пазнаў, толькі бабулькі ля касьцёлу нарэшце прыгадалі маю маці — настаўніцу беларускай мовы, а потым ідэнтыфікавалі й мяне». Больш на Бацькаўшчыну ён не паехаў...**

**Дзевятнаццатае стагодзьдзе сталася для швэдаў тым жа, чым для беларусаў — дваццатае. Тады ад татальнай нэндзы з Швэцыі ў Новы Сьвет зьехала 25% насельніцтва. Толькі жменька зь іх наведала Бацькаўшчыну. Пра аднаго з герояў ідзе гаворка ў апавяданьні «Адна хвілінка на зямлі» швэдзкага клясыка Вільгельма Мубэрга (1898—1973), якое я ласкава прапаную чытачу.**

**Андрэй Катлярчук**



WWW.OSMEDUSTOCKHOLM.SE

Вільгельм Мубэрг (1898—1973). Аўтар трылёгіі «Кнут Турынг» (1935—1939), гістарычнага раману «Начны пасланец» (1941), «Жаўнер з зламанай стрэльбай» (1944).

Вільгельм Мубэрг

# Адна хвілінка на зямлі

Чэрвеньскім вечарам я сышоў зь цягніка на станцыі майго дзяцінства. Сорак два гады таму, такім самым чэрвеньскім вечарам, я зайшоў у той самы цягнік на той самай станцыі, каб паехаць туды, адкуль прыехаў цяпер. Гэта быў мой другі доўгі вечар на пэроне. Я падумаў: «Вось паміж гэтымі двума вечарамі прамітусілася ўсё маё жыцьцё», — ды апусьціў торбу на пэрон. Потым дзьве хвілінкі стаяў моўчкі каля торбы, каб такім чынам сканцэнтраваць кранальныя ўспаміны на пасадцы, што адбылася сорак два гады таму. Тады я быў не адзін. Мая сястра Джэні праводзіла мяне да станцыі (маці й бацьку не хацелася ісьці да вакзалу). Я памятаю сваё «да пабачэньня» колькім землякам на пэроне. Здаецца, у той вечар я быў самым заўважным чалавекам ля вакзалу.

Цяпер я стаю тут зусім адзін. Ніхто не прыйшоў сустрэць мяне. Ніхто ня знаў, што я прыеду, прыеду дахаты. Вялікі натоўп сабраўся ля станцыі, але я ня ўбачыў нікога з тых, каго ведаў. І ніхто не пазнаў мяне.

Я кінуў позірк на цягнік, які зьнікаў за паваротам. Калісьці там стаяла будка чыгуначніка. Апошнюю гадзіну майго падарожжа я быў адзін у купэ. Кандуктар паведаміў, што наша ветка чыгункі беспэрспэктыўная. Народу жыве няшмат, большасьць аддае перавагу таньнейшым аўтобусам. У далёкім 1872 годзе пабудова чыгункі адчыніла для нашых мясьцінаў вялікі сьвет. Мая маці любіла апавядаць, як шасьцігадовай дзяўчынкай была на ўрачыстым адкрыцьці станцыі ды пабачыла самога караля Швэцыі. Гэта была вялізная падзея ў яе жыцьці і, шчыра кажучы, адзіны раз, калі яна бачыла важнага чалавека з сталіцы.

Кожную нядзелю мы, местачковыя хлопчыкі, бегалі на станцыю — глядзець цягнік, які спыняўся на адну хвіліну. Але нас цікавіў лякаматыў, які гудзеў сваёй трубой так, аж здавалася, што ён хутка зарагоча па-валатоўску. Пасьля дзевяноста гадоў шчырай службы колы гаротніка спыніліся, і сёньня лякаматыў стаіць ля раённага музэю, а сучасныя хлопчыкі весела рагочуць з старога ды сьмешнага хламу.

Я зірнуў на рэйкі. На многа мёртвых чыгуначных кілямэтраў расьцягнуліся яны праз вясковую глыбінку. Але хутка змоўкне рыканьне цягніка, вялікі лес верне сваю ўладу і цішыня запануе навокал. Калі гэты час прыйдзе, люд скажа: вось, калісьці тут праходзіла чыгунка, але дарэмна, сёньня вы не пабачыце нават спарахнелых шпалаў.

Людзі, якіх было так шмат падчас прыбыцьця цягніка, хутка сышлі. Я таптаўся абсалютна адзін ля сваёй торбы, як чужынец, які выйшаў памылкова не на той станцыі. Чыгуначнік прайшоў міма-ходзь, паведаміў, зацікаўлена пазіраючы ў мой бок: «За будынкам вакзалу стаяць таксоўкі, калі вам трэба машына». — «Дзякуй, — адказаў я, — але я зьбіраюся спыніцца ў новай гасьцініцы ля вакзалу». Чыгуначнік зьдзівіўся ды папытаў: «Скуль вы ведаеце, што мы маем уласны гатэль?»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Само сабой, я ведаў, што інфраструктура мястэчка разьвілася за апошні час вакол станцыі, ці вакзалу, як паважліва назваў яе чыгуначнік. Новая вуліца, новыя будынкі, крамы, запраўка, нарэшце, аўтастанцыя, у суботы звычайна поўная сялянаў з далёкіх вёсак. Я ведаў, што з часу майго апошняга візыту жыцьцё мястэчка істотна зьмянілася.

Але цяпер я пабачыў новыя вялікія зьмены. Кідалася ў вочы мноства навінак, запазычаных у Злучаных Штатаў. Але рэчы, якія штодня я бачыў у Амэрыцы, чамусьці не пасавалі да вобразу Бацькаўшчыны. Выглядалі прымусова накінутымі і штучнымі, асабліва тут, у Смалянд-зкай глыбінцы. Дзіва, але тое, што было натуральным на эміграцыі, зрабілася невыносна чужым на Радзіме.

Увесь дзень я блукаў у родных ваколіцах. Не пазнаваў сустрэчных, а яны не пазнавалі мяне. Спаткалася колькі аднагодкаў. Гэта мусілі быць сябры дзяцінства. Але я ня мог пазнаць іх зьмененыя старасьцю твары. Гэта былі ня тыя людзі, якіх я ведаў. Яны таксама ўглядаліся ў мяне. Але ім было цяжка знайсьці мяне пад сёньняшнім тварам. Яны адчувалі, што я, мабыць, чалавек свой, блізкі, але не маглі вызначыць дакладна, хто я такі, таму мінали мяне. Мы былі як чужынцы, якія ўначы раптам сустрэліся на дарозе. Але горш за ўсё было сустракаць моладзь, якая вырасла ў мястэчку пасьля таго, як я пакінуў Бацькаўшчыну. Для іх я быў прывідам, які раптоўна вярнуўся зь нябыту і невядома навошта швэндаецца вуліцамі. Для іх я быў нібыта пачвара ці мярцьвяк, што ўстаў з труны ды апоўначы блукае па мястэчку, бразгае ў дзьверы, дарэмна шукаючы родную хату.

Я азіраўся — але навокал усё было незваротна зачыненае для мяне. Адчуваў сябе турыстам на ўласнай Радзіме. Зрэшты, прыйшла апошняя ясная выснова: я ня маю больш ніякага дачыненьня да гэтай зямлі. Маёй Бацькаўшчыны, якой я належаў, больш не існуе.

**Пераклаў з швэдзкай Андрэй Катлярчук**

паводле: Vilhelm Moberg. *Din stund pe jorden.* Stockholm, 1998.



Гаворыць Сяргей Сідорскі

PHOTO.BYMEDIA.NET

## Новы «моцны чалавек»

Замест заплянаванага візыту ў Маскву да расейскага прэм'ера Касьянава, Сяргей Сідорскі накіраваўся ў Вену. Паседжаньне назіральнай рады «Прыёрбанку» выявілася для ўраду значнейшым за перамовы з «Газпромам», які ад пачатку году перапыніў пастаўкі ў Беларусь **(старонка 7)**. Гэтым цяперашні прэм'эр-міністар розьніцца ад папярэднік — ціхіх і рахманых тэхнакратаў. Дый візытаў на Захад ад Бугу Сідорскі ажыцьцявіў больш, чым ягоны папярэднік. Унутры краіны ён вылучаецца яркімі рашэньнямі. Так, 8 студзеня запатрабаваў ад ураду (!) да канца студзеня даць аб'ектыўную ацэнку (!!) дзейнасьці ў 2003 г. кожнага міністра. Замяніце «Сідорскі» на «Блэр» і прачытайце фразу ўголас. Новы прэм'ер робіць уражаньне «кіраўніка лукашэнкаўскага тыпу» і новага моцнага чалавека Беларусі, «вартага пераемніка» Лукашэнкі.

## Севярынец пайшоў ва-банк

Створаная Севярынцам «Маладая Беларусь» — крок рызыкоўны. Яна адцягне частку актывістаў зь «Пяцёркі-плюс» ды «Эўракааліцыі». Або Севярынец стане дэпутатам, або вылеціць з «апазыцыйнае сыстэмы». **Старонка 5**.

## Сорас супраць Буша

Мільярдэр Джордж Сорас у панядзелак зьвінаваціў кіраўніка Белага дому ў імкненьні ўсталяваць амэрыканскую гегемонію ў сьвеце. Гэта недасяжна, тым больш шляхам вайны, лічыць Сорас. Амэрыканская палітыка, на яго думку, нагадвае парадкі на оруэлаўскай фэрме, дзе рэй вялі сьвіньні. Сорас уклаў 12,5 млн даляраў у кампанію, пакліканую пераканаць амэрыканцаў не абіраць Буша на другі тэрмін.

# Цыфэрбла-бла ў Мантэнэгра

пародыя

Усе супадзеньні абсалютна выпадковыя.

Цыфэрбла-бла, калі хто ня ведае, жыве ў Горадні ў зламаных гадзіньніках. Заўсёды мае пры сабе малаток, і калі каго цюкне... Пра гэта гісторыя.

...Прачнуўся. Няголены. З Новага году не запомнілася нічога. Штосьці ў розных баках выбухала, лётала па небе з галасьлівым посьвістам. Пайшоў да касьцёлу. Спачатку на ганку пачакаў з дыктафонам, пакуль не пачне адбівац час гадзіньнік на званіцы. Бом-бом-бом!

Гадзіньнікі — як жывыя істоты. Гадзіньнік у пакоі. Загадкавы рух стрэлак. Гук зьнікае, яго не чутно, толькі бачна, што стрэлкі не спыняюцца. Цік-цік-цік — бязгучна. Невытлумачальна.

«Невытлумачальна!» Бывае — доўгімі белымі начамі. Нэрвовы цік зь левай шчакі караскаецца па вусах на праўю. Ад гарачкі ночы надта ж доўгія. І белыя. Калі зірнуў і бачыш, як гук зьнікае і зноў вяртаецца. Калі да вуха прыклаў і ўсё адно бачыш: стрэлкі паўзуць. Але гэтым разам не гарачка — тое была Цыфэрбла-бла. Калі Цыфэрбла-бла каго сваім малатком цюкне, немагчымае можа здарыцца. Часам душа са цела выскачыць ды іншую ў госьці прыцягне. Цыфэрбла-бла-бла на ўсё здатная.

Занепакоены, рушыў у кавярню. Хацеў ветліва, рег «калі ласка», папрасіць філіжанку кавы. Выскачыла нахабнае расейска-савецкае: «ТЫ!» І ніякага сораму. *Падсьць* невераготная. Мяне ж тут усе ведаюць! Нечакана адчуваю бадзёрасьць і аптымізм: «ТЫ! Навошта табе эўрапейскасьць тая з-пад Фары Вітаўта? Гайда ў Мантэнэгра!»

...Там ты выбіраеш у кавярні столік з выглядам на мора, замаўляеш келіх «Вранацу» і думаеш, што ёсьць на сьвеце гарады, якія... — якім... — пра якія... — у якіх... ты адчуеш сябе беларусам. Да чорта гадзіньнікі, да чорта рыпучыя скрынкі! Ты напішаш пра беларускіх вампіраў. Менавіта пра беларускіх — нацыянальна-арыентаваных, сьвядомых прыхільнікаў дзяржаўнага сувэрэнітэту Бацькаўшчыны, якія… якіх… зь якімі… Карацей, мы пішам і перамагаем канкурэнтаў у барацьбе за газэтную плошчу. Гераічна-калядная сага для «Нашай Нівы». Мантэнэгра. Монтэ-Карла. Монтэ-Крыста.

Абы, крый Божа, ня Монтэ-Касіна... Прэч, чорныя думкі! Разьняволенасьць неймаверная. Нарэшце можаш прызнацца, што ты амаль з асалодаю чытаеш дзёньнік Вячаслава Адамчыка. Ты гатовы падпісацца пад Адамчыкавым партрэтам аднаго зь сяброў рады Саюзу пісьменьнікаў, самазадаволенага вепрука, зь якім... О, я скажу вам, што вампіры — зусім ня кепскі ідэал! Liberum Veto вярнулася, старыя слаўныя часы, залатая вольнасьць. Спыніць гадзіньнікі. Пісаць, пісаць, пісаць... Калі выйдзе зусім бязглузда, надрукую ў «НН» на Каляды.

Бяру ў руку неасьвячоную крэйду і пішу проста на сцяне пракаветнага будынку — сёлетні, леташні, заўтрашні запіс. Адчуваю, гэта будзе векапомна.

«ТЫ! ТЫ! ТЫ! ТЫ! ТЫ! ТЫ! ТЫ! ТЫ! ТЫ!»

...Разумееш, у гэтым стане нічога іншага ня пішацца. О, мае гадзіньнікі, мае ксяндзы і кавярні!

Трэба ўжыць спэцыяльныя сродкі. Трансыльванскі ружовы шампан «Dracula». Раскруціў драцяны жгуцік, зьняў фальговы каптур, абхапіў корак. Вып'ем за волю, вып'ем за долю. Сам з сабою. Двойчы. За зьліцьцё душаў.

Бом-бом-бом! Хутчэй! Дзвынк-дзвынк-дзвынк — ура!

Дарма было ўракавацца. Тое ня душы зьліліся — зноў Цыфэрбла-бла цюкнула. Адбаляваліся.

...Рэшткі салютаў. Шумавіньне сьвяточнасьці. Але ТЫ ўжо даўно спаў. Нічога ня чуў і ня ведаў. І не хацеў. Давялося пісаць пра гадзіньнікі й доўгія белыя ночы. Адбаляваліся. Шматзначнае слова, калі закрэсьліваць па чарзе літары.

Горадня. Горад, дзе ўсё можа здарыцца.

**AstraJecji**



Людка Сільнова

## Жаночы капрыз

Хачу цябе я неймаверна
Пабачыць у якой таверне
Сярод брутальных тыпажоў,
Бутэлек, дыму і нажоў;
А ці ў якой — парадаксальна! —
Старой, гарачай прасавальні:
Той жэст, як ты хапаеш прас,
Ці нож, ці пісталет, — хоць раз!..

Чаму хачу я — вышай сілы
Маёй цярпець! — убачыць, мілы,
Што ты, нягледзячы на век
І час, — мужчына, чалавек?
Мо сумняваюся — у гэтым,
Адкідваючы ўбок газэты?

У гэтым толькі, дарагі!..
Й ня лі віно па берагі.

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**А.А., А.С. з Гомелю.** Інфармацыя пра такія падзеі, як фэстываль «Рэнэсанс гітары», надзвычай хутка старэе. А Ваш ліст трапіў у «НН» аж праз два тыдні пасьля скончаньня імпрэзы. Улічыце гэта надалей. Бо хацелася б атрымаць ад спадарства яшчэ штосьці на музычныя тэмы — файна ў Вас выходзіць.

**Г.Л. зь Менску.** Ня маеце Вы рацыі, калі кажаце, што адсутнасьць сапраўды нацыянальнае сыстэмы адукацыі ды тэлебачаньня — віна «рускіх», што «захапілі кіруючыя пасады ва ўсіх органах». На тых пасадах — беларусы, якія часта маюць комплекс нацыянальнае непаўнавартасьці. Пазбавіцца ад яго адразу цяжка, але жыцьцё ў незалежнай дзяржаве ўсё паставіць на свае месцы.

**Сяргею Ч. з Слоніму.** 90 гадоў — ня нійская дата. Мы трымаемся ў календары кроку 25 гадоў. Напісана сухавата.

**Абвяржэньне.**

У газэце «Навіны» №41 ад 14 красавіка 1999 г. у маім артыкуле «Дзе каньяк Старавойтава?» было напісана: «У прыватнасьці, гаворка ішла пра 40 бутэлек малдаўскага каньяку «Белый аист», які былі канфіскаваныя сьледчымі з дому былога старшыні «Рассвету». Паводле дадзеных Страмкоўскай, падобным каньяком частаваліся сьледчыя на дзень нараджэньня Смаленцава, які адзначаўся, калі ўжо ішоў суд над Старавойтавым». Прашу лічыць гэтыя зьвесткі не адпаведнымі рэчаіснасьці. **Алег Грузьдзіловіч**

Газэта «Наша Ніва» дзякуе за падтрымку спадару Кастусю Акулу (Таронта).

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншуем Вінаградава Віталя** з 18-годзьдзем. Жадаем пасьпяховага жыцьцёвага шляху. Зьміцер і К.

**Віншую** свайго сябра Астроўскага Юрася з 18-годзьдзем. Усяго табе! Аляксей

**Віншую цябе**, мой даражэнькі Мусічак! Вясёлкавых сноў табе і сонечных дзён! Тусік

**Увесь беларускі** народ (прынамсі, яго хворая частка) натоўпам бяжыць віншаваць Тацяну Водзіч зь юбілеем. Жывем!

**Мус!** З народзінамі цябе! Твая Малпа

**Беларускія лекары**, увага! У найлепшай з вашых шэрагаў — сьвята нараджэньня. Віншуем, спн.Водзіч. Посьпехаў

**Аматары піва** віншуюць свайго надзейнага сябра (па сумяшчальніцтве лекарку) з народзінамі. Працы шмат. Яшчэ не каштавалі «Александрыю»!

### КАНТАКТЫ

**Адгукніся**, каханая, можа, холадна, любая?.. 39/180/76, Віктар, цікавы і сьмелы, шматгранны. Т.: (01713) 41-3-91

**Хадзі да нас** у гэты час, бо ты патрэбен нам якраз. Т.: 211-85-85, аб.24057. Пакінь сродак сувязі. Моладзевая ініцыятыва «Вока»

### КНІГІ, ВІДЭА

**Куплю** часопіс «Дзеяслоў» №2. Т.: (0215) 42-17-96

**Куплю** дарага «Расейска-беларускі слоўнік» С.Некрашэвіча, Байкова, 1928 г. або копію зь яго. Вул.Асаналіева, 5-7, 220024, Менск

**Прадам** асобныя нумары «Спадчыны», «Беларускай мінуўшчыны» 90-х гадоў. Т.: (01771) 5-78-95

**Відэа** «Глядыятар», «Маленькі Сьцюарт», «Дыназаўр», «Шрэк» і іншае можна набыць у Гомелі. Т.: 45-11-51

**Прадаю частку** хатняга кнігазбору (гісторыя Беларусі, краязнаўства, мовазнаўства, мастацкая літаратура). Т.: 8-029-400-45-91 (кошт званка 147 р/хв)

**У Гомелі** можна набыць кнігу В.Быкава «Доўгая дарога дадому». Т.: 45-11-51

**Беларускія** кнігі, CD, аўдыё і відэа ў Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю да 13.00. Т.: 45-11-51

**У Гомелі** можна набыць кнігу З.Пазьняка «Новае стагодзьдзе». Т.: 45-11-51

**Шырокі выбар** беларускіх кніг у Гомелі. Т.: 45-11-51 (увечары), e-mail: bandrej@tut.byпраца

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай мове, літаратуры, гісторыі. Т.: 235-18-72 (пасьля 16.00). Юрась

**Праца**. Рэальныя заробкі. Навучаньне бясплатнае. Зьміцер. Т.: 8-029-766-12-79

### ФЭЛЬЧАР-СТАМАТОЛЯГ

**Спадары** беларусы. Трэба праца для маладога спэцыяліста. Фэльчар-стаматоляг. Аршанская мэдвучэльня. Разьмеркаваньне ў лютым. Т.: 5-25-40. Марыя

ЗАПРАШАЕМ
**30 студзеня — 2 лютага**
**«Золота підкова» Львоўшчыны**
Упершыню ў Беларусі — гістарычная экскурсія па **Львове** і шасьці навакольных замках (**Алеськ, Падгорцы, Залочыў, Крэхіў, Жоўква, Сьвірж**).
Два дні — начоўка ў гатэлі турклясы. Кошт — 45 у.а. (студэнтам — зьніжкі).
Дакраніся да гісторыі!
Тэлефануйце: **222-88-61, 8-029-779-83-10.**
Заходзьце: вул.Фабрыцыюса, 9, пакой 13

**Запрашаем**
**на падарожжа 25 студзеня** (нядзеля) па маршруце: Менск — Ішкалдзь — Вольна — Паланечка — Завосьсе — Сталовічы — Новая Мыш — Баранавічы — Крошын — Менск.
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
Т.: 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ
Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.
**Тэкст** ____
**Імя і прозьвішча** ____
**Адрас, тэлефон** ____

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
галоўны рэдактар Андрэй Дынько
выпускны рэдактар Арцём Лява
карэктар Сяргей Петрыкевіч
карэктарка Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3404. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 14.01.2004.
Замова № 223.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а